№ 4(44)/2002

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, чэрвень-ліпень 2002 г.



(Фота З. Пазьняка)

kamunikat.org

## ШЧЫРА МАЛЮСЯ

Божа адзіны, я веру табе,
Веру і шчыра малюся:
Не пакідай нас у цяжкай журбе,
Не пакідай нас у скрусе.

Не за сябе, за Радзіму прашу, —
За Беларусь дарагую.
Сэрца любові я ёй аддаю, —
Дзе ж я прыдбаю другую.

Тут мае продкі жылі да мяне,
Дзяды-прадзяды і бабулі
Што ў маленстве люлялі мяне:
Люлі, унучанька, люлі.

Тут я убачыла упершыню
Нашы лугі і пагоркі.
Тут удыхнула настой палыну,
Водар той лекавы горкі.

Тут я сустрэла каханьне сваё.
Тут нарадзіліся дзеці.
Тут маё шчасьце і гора маё,
Край мой, найлепшы ў сьвеце!

Божачка, дай жа нам ласкі свае,
Шчасьце пашлі Беларусі.
Гора, галечу адрынь ад Яе.
Шчыра аб гэтым малюся!

***Яўгенія КАЗЛОВА*** *(Ворша)*

## АБ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ АГРЭСІІ ВЫШЭЙШАГА КІРАЎНІЦТВА РАСЕІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ

Вышэйшае кіраўніцтва Расейскай Фэдэрацыі распачало адкрытую агрэсіўную інфармацыйную падрыхтоўку да анэксіі Беларусі. Сігнал даў 24 чэрвеня 2002 г. У. Пуцін падчас пашыранай прэс-канфэрэнцыі. Кагэбісцкі рэжым Крамля вырашыў, што настаў час і магчымасьць адкінуць гульню ў інтэграцыю, у „саюзную дзяржаву”, у пошукі „законнага” шляху паглынаньня Беларусі і правесьці гвалтоўны і незаконны аншлюс, пра што і агучыў У. Пуцін на ўпамянёнай прэс-канфэрэнцыі.

10 ліпеня 2002 г. міністар замежных справаў РФ І. Іваноў у інтэрв'ю газэце „Известия" пры высьвятленьні праблемы Калінінградзкай вобласьці мяжу Беларусі зь Летувой вызначыў як расейскую мяжу. Адказваючы на пытаньне карэспандэнта, што такое транзіт праз Летуву, ён сказаў наступнае: „Передвижение по территории Литвы от одной российской границы до другой".

Вядома, што існуе толькі адна мяжа Расейскай Фэдэрацыі зь Летувой, а менавіта з Калінінградзкай вобласьцю. Такое выказваньне І. Іванова ёсьць акт інфармацыйнай агрэсіі супраць суверэннага статусу Беларусі.

Сойм *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* падтрымлівае пратэст, які выказаны ў ноце *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі* да Міністэрства замежных справаў Расейскай Фэдэрацыі, якая прынятая Радай 14.07.2002 г. ў сувязі з агрэсіўным выказваньнем І. Іванова.

Заклікаем грамадзянаў Беларусі супроцьстаяць канкрэтным праявам інфармацыйнай вайны з боку расейскага імпэрскага рэжыму і яго сродкаў масавай інфармацыі.

Заклікаем беларусаў гуртавацца дзеля абароны незалежнасьці і канстытуцыйнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Нагадваем чыноўнікам лукашэнкаўскага рэжыму пра адказнасьць за захаваньне незалежнасьці і тэрытарыяльнай цэласнасьці Рэспублікі Беларусь перад беларускай нацыяй, перад сёньняшнім і будучымі пакаленьнямі беларускага народу.

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь ёсьць жыцьцёвая прастора беларускага народа і яе абарона ёсьць сьвятая справа кожнага беларуса.

*20 ліпеня 2002 г.*

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

# АБАРАНІЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СУВЕРЭНІТЭТ БЕЛАРУСІ — ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА

Ёсьць шмат пытаньняў агульных для беларусаў замежжа, але ўсё найперш вызначаецца на Бацькаўшчыне, у Беларусі. Пакуль ёсьць незалежная дзяржава Беларусь, датуль у замежжы прызнаецца нацыянальны і грамадзянскі статус беларусаў. Ліквідацыя незалежнасьці краіны прывяла б да фатальнага пагаршэньня становішча беларусаў ва ўсім сьвеце. Беларусы ўжо маюць такі адмоўны вопыт.

Аб пагрозе незалежнасьці Беларусі з боку Расеі гаворыцца вось ужо хутка 10 гадоў. Аднак грамадзтва, у якім разбураны гістарычны вопыт, дэфармаваныя нацыянальная сьведамасьць і памяць, — такое грамадзтва робіць высновы не перад, а пасьля падзеяў (калі ўжо можа быць запозна). Тут цяжкасьць. Аднак задача нашага пакаленьня — прадухіліць нацыянальную катастрофу.

Мы мусім улічваць пастаянныя чыньнікі, якія прысутнічаюць у эўрапейскай і расейскай палітыцы, незалежна ад часу і ад палітычнай афарбоўкі ўлады. Пакуль будзе існаваць Расея як канглямэрат народаў у рускай цэнтралізаванай дзяржаве, датуль, незалежна ад таго, хто сядзіць у Крамлі (лібэралы, дэмакраты, манархісты ці камуністы), датуль будзе праводзіцца вялікадзяржаўная шавіністычная палітыка. Ігнараваць гэты чыньнік, дагаджаючы нейкай „дыпляматыі" ці зыходзячы з часовых меркаваньняў, — нельга. Можна, скажам, імкнуцца зьмяніць імпэрскую агрэсіўную прыроду Расеі (як гэта ілюзорна і наіўна спрабуе рабіць Амэрыка), але нельга ігнараваць яе сутнасьць.

Палітыка Расеі на захадзе ў дачыненьні да Беларусі ўвесь час такая ж нязьменная, як на Каўказе, у Азіі, на Далёкім Усходзе, ці ў іншых частках імпэрыі. З той толькі розьніцай, што ў ерархіі яе значэньняў заходні (беларускі) накірунак ацэнены як накірунак №1.

Напачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ва Ўсходняй Эўропе абазначылася хвалюючая для аналітыкаў сітуацыя. Пасьля распаду Савецкага Саюза незалежная Беларусь пры нармальным разьвіцьці мела шанец за кароткі час (5-8 гадоў) стаць самай эканамічна разьвітай і магутнай краінай рэгіёна (гэтакім драконам ва Ўсходняй Эўропе).

Эканамічны патэнцыял Беларусі перавышаў патэнцыял Польшчы, тут была самая магутная армія ва Ўсходняй Эўропе (ядзерная зброя і т.п.), разьвітая сельская гаспадарка, вялікая колькасьць ворнай зямлі, навукаёмкая вытворчасьць, усе галіны прамысловасьці і вытворчасьці, разьвітая фундамэнтальная навука, істотныя прыродныя рэсурсы, кваліфікаваныя рабочыя, мноства тэхнічных спэцыялістаў, структураваная сістэма адукацыі і г.д. І пры гэтым — адкрытая сістэма эканомікі (гэта значыць, разьлічаная на вытворчасьць тавараў і таварны рынак).

Мы, *дэпутаты ад Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце*, добра разумелі тады магчымасьці Беларусі. На аснове гэтай пазыцыі (тут я зраблю адступленьне ў бок) у кастрычніку-лістападзе 1990 года была спроба заахвоціць у нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ўрад В. Кебіча. Гэта было зьвязана з нашай ідэяй Балта-Чарнаморскай садружнасьці усходне-эўрапейскіх краінаў. У 1990 годзе мы арганізавалі ў Менску дзьве Балта-Чарнаморскія міжнародныя канфэрэнцыі. (Прычым адна зь іх, па дамоўленасьці з В. Кебічам, адбывалася ў Доме ўраду ў зале Савета Міністраў БССР і ў Вярхоўным Савеце.)

Крэмль, аднак, рашуча націснуў на Кебіча, пасьля чаго той здаўся і адступіў. Далей рэакцыя Масквы супраць Балта-Чарнаморскай ідэі была вельмі нэрвовай.

Хуткае зьяўленьне беларускага дракона на ўсходзе Эўропы магло б абазначаць канец расейскай імпэрыі, імгненную дэвальвацыю імпэрскіх ідэяў і ўсіх надзьмутых аргумантаў пра „вялікасьць", „шырокасьць" і ўсялякую там „ісьціннасьць" Расеі.

Атака Расеі на Беларусь была неўнікнёнай. І неўзабаве яна пачалася ўжо ў 1992 годзе (за часы дзейнасьці ў Расеі ўраду Гайдара).

Характэрнасьць беларускай сітуацыі была, аднак, у тым, што спыненьне ўлады КПСС і вяртаньне незалежнасьці краіны было дасягнута малымі сіламі, фактычна, толькі Беларускім нацыянальна-вызвольным авангардам (Народным Фронтам), які, маючы энэргічную фракцыю ў Вярхоўным Савеце, добра выкарыстаў становішча.

Беларускае грамадзтва, аднак, у цэлым было яшчэ не падрыхтаванае да пераменаў, а савецкая намэнклятура, у руках якой засталася ўлада на Беларусі, ня мела ніякіх паняцьцяў пра беларускую геапалітыку і вельмі цьмяныя ўяўленьні пра дзяржаўную дзейнасьць у рэжыме суверэнітэту, да якога беларуская каляніяльная адміністрацыя ніколі не імкнулася.

Расея скарыстала гэтае становішча. Ужо ў другой палове 1992 года, праз КГБ, быў устаноўлены жорсткі кантроль Масквы над урадам В. Кебіча, забаронены рэфэрэндум аб новых выбарах (якога дамогся БНФ), уключаны (з Расеі) мэханізм гіпэрінфляцыі і рабаваньне Беларускай краіны (насельніцтва, эканомікі, дзяржаўнай маёмасьці).

У 1994 годзе Масква, пры дапамозе КГБ, законным спосабам прыводзіць на вяршыню ўлады ў Беларусі сваю крэатуру. Пачынаецца новы этап расейскай палітыкі — этап падрыхтоўкі анэксіі Беларусі.

Тут я адзначу толькі галоўнае. Рэжым, што існуе цяпер на Беларусі, створаны, перш за ўсё, Масквой з мэтай падрыхтаваць Беларусь да здачы пад Расею. Дзеля гэтай мэты была прыдумана і прыстасавана дактрына „інтэграцыі" („саюзу") Беларусі з Расеяй, што давала магчымасьць расейцам весьці працу па ўніфікацыі беларускага заканадаўства (падвядзеньне яго пад расейскае), а таксама дзяржаўных структураў, мытных правілаў, узброеных сілаў і спэцслужбаў, дазволіла ствараць так званыя „саюзныя ворганы",

праводзіць сумесныя „калегіі” міністэрстваў, і наладзіць такім чынам поўны кантроль над галоўнымі галінамі беларускай унутранай і зьнешняй палітыкі.

На працягу шэрагу гадоў, бясконца гаворачы пра „саюз” і „інтэграцыю”, рэжым на Беларусі развальваў асновы нацыянальнай дзяржаўнасьці краіны, зьнішчаў магчымасьці нацыянальна-культурнай кансалідацыі, верагоднасьць эканамічнага і палітычнага змаганьня беларускай нацыі супраць расейскай агрэсіўнай палітыкі. На сёньняшні дзень мэтанакіравана разбурана беларуская эканоміка, закансэрваваныя непэрспэктыўныя, стратныя яе накірункі, даведзеныя да заняпаду прадпрыемствы. Мэтанакіравана дапушчана вялікая зношанасьць тэхнічных рэсурсаў краіны, абмежаваны і даведзены да дэградацыі ўвесь так званы беларускі „бізнэс”, амаль ліквідаваная беларуская школа і нацыянальная адукацыя. Ліквідаваныя нацыянальна-дзяржаўныя сымвалы Беларусі (гэрб і сьцяг), беларуская мова выгнаная з афіцыйнага ўжытку, разбураецца фундамэнтальная навука, спыненае фінансаваньне бібліятэкаў і цэлых галінаў беларускай культуры, зьнішчаны, практычна поўнасьцю, беларускі нацыянальны друк, беларускія сродкі электроннай інфармацыі, дабіваецца беларускае кнігадрукаваньне.

Каб зрабіць такую каласальную разбуральную працу ў Беларусі за кароткі час і ўпарта рухаць „інтэграцыйную” дэмагогію, мала б было толькі палітычнага рэсурсу расейскай агентуры, і нават усёй старой непавароткай савецкай сістэмы. (Памятаем, што сістэма КПСС ужо не існуе.)

Тым часам „рэсурс” быў знойдзены (і даволі арыгінальны). Пра гэта палітыкі Народнага Фронту казалі і пісалі яшчэ ў 1995 годзе. (Успомнім артыкул *Сяргея Навумчыка „Мэта”* пра пляны Лукашэнкі стаць прэзыдэнтам Расеі.) Я глыбока перакананы, што ідэю аб’яднацца з Расеяй, пэрспэктыву стаць прэзыдэнтам у Маскве і надзею на крамлёўскае царства запалілі ў галаве Лукашэнкі маскоўскія стратэгі імпэрскай палітыкі. Яна стала маторам у душы гэтага чалавека, апантанага ідэяй-фікс, якая прымусіла яго ісьці напралом, нават па касьцях беларускага народа.

Бяз гэтай шалёнай надзеі, бяз гэтакага асабістага пляну на „царства” — усё выглядала б крыху інакш. Лукашэнка наўрад ці ахвяраваўся б гэтак яра толькі дзеля расейскай ідэі, без вялікага ўласнага інтэрасу. Наўрад ці ён быў бы такім хваравіта ўпартым і пасьлядоўным.

Масква маніпулявала сваёй марыянэткай, і, каб трымаць ініцыятыву ў гульні, пастаянна вінавацiла яго ў тым, што ён, маўляў, хоча ашукаць Расею, уцягнуць яе ў нявыгадны ёй „саюз”, пакарыстацца зь яе і г.д. Сцьвярджалася, што гэта, маўляў, ён хоча маніпуляваць Расеяй, падгрэбці яе пад сябе і г.д.

Але настаў час, і ў чэрвені гэтага года маскоўскія лялькаводы, прыдушыўшы Беларусь і загнаўшы Лукашэнку ў кут, заявілі адкрыта: ніякіх саюзаў, толькі адна дзяржава, толькі анэксія Беларусі. Зьмянілася тэрміналёгія, пачалася новая дыпляматыя і гульня адкрыта крымінальнага, гітлераўскага кшталту. (***Анэксія ня можа ажыцьцяўляцца законна. Гэта беззаконьне, якое чынецца сілай, гвалтам і ашуканствам.***)

Славаблудзтва, якое зараз штучна выклікана вакол заявы Пуціна, можна не прымаць пад увагу, зьмест заявы зразумелы без камэнтароў.

Небясьпека для беларускай незалежнасьці павялічылася. Расейская Дума нават закон прыняла на выпадак анэксіі: „О порядке принятия в Российскую Федерацию...” Рыхтуецца таксама закон „О борьбе с экстремизмом”. Гэта каб пасьля захопу Беларусі можна б было аб’явіць *Беларускі Нацыянальна-Вызвольны Адраджэнцкі Рух* экстрэмісцкім і расправіцца зь беларускімі патрыётамі і зь беларускай інтэлігенцыяй пад маркай „барацьбы з тэрарызмам”. Чачэнія — выразны прыклад.

Сітуацыя на Беларусі, аднак, значна ўскладнілася невідочным раней чыньнікам заходняй палітыкі (перш за ўсё, нямецкай), геапалітычныя і эканамічныя аспэкты якой напачатку былі проста невядомыя беларускаму грамадзтву.

Аднак ўжо ў пачатку 90-х гадоў было зразумела, што стварэньне і ўмацаваньне асобнага палітыка-эканамічнага і культурнага рэгіёну Ўсходняй Эўропы непатрэбна ні Расеі, ні Захаду. На Захадзе насьцярожана і варожа ўспрынялі ідэю Балта-Чарнаморскай садружнасьці.



(Фота Ганны Кандрацюк, „Ніва”)

***Браслаўшчына вечная і прыўкрасная...***

Абодва бакі задавальняла ідэя аб падзеле ўплываў ва Ўсходняй Эўропе паміж Расеяй і Захадам. Змаганьне ў той ці іншай форме ішло за кожную краіну. (Успомнім сітуацыю ўваходжаньня Польшчы, Чэхіі і Вугоршчыны ў НАТО.) Цяпер барацьба сканцэнтравалася на Беларусі.

Адкрытым прыхільнікам беларускай свабоды, дэмакратыі і незалежнасьці зьяўляюцца Злучаныя Штаты Амэрыкі. Тым часам прыхільнікам палітыкі Расеі ёсьць Нямеччына, якая дамінуе ў Эўразьвязе і ў АБСЭ і скрыта падтрымлівае пляны анэксіі Беларусі Расеяй.

Выказваньні вядомых нямецкіх палітыкаў (Шродэра, Штойбэра) адназначныя: немцы, маўляў, павінны праводзіць сумесную палітыку з Расеяй. Гэта зьвязана, перш за ўсё, з праблемай і нямецкімі плянамі ў Калінінградзкай вобласьці, з так званым „калідорам” праз Польшчу ці Летуву, з магчымай дэпартацыяй састарэлага рускага насельніцтва з Калінінграда ў Беларусь (як гэта было ў 1990 годзе — з Усходняй Нямеччыны) і ў пэрспэктыве — зь верагодным вырашэньнем пытаньня польскага мамор’я (Гданьск, Гдыня, Сопат і г.д.).

Разьменнай манэтай у гэтых выказваньнях і плянах зьяўляецца Беларусь, дзе Расея (а ў выніку „калідора” — таксама і Нямеччына) мае інтарэсы транзітныя, эканамічныя, стратэгічныя і ўвогуле — вялікадзяржаўныя.

Становішча Беларусі ў гэтай раскладцы ўскладняецца тым, што ўлада ў Беларускай дзяржаве акупаваная Масквой (тое, што мы называем тэрмінам „унутраная акупацыя”) і краіна ня можа праводзіць самастойнай нацыянальнай палітыкі. Беларусь апынулася ў пастцы, ва ўнутраным катле, дзе беларуская культура і нацыянальныя рэсурсы — вынішчаюцца, і нацыя гіне ў маўклівасьці, бо вораг, фармальна, — нібы і нябачны.

Што ж прынесла ў гэты трагічны час у Беларусь лібэральная Эўропа са сваімі „місіямі”, фондамі для „дэмакратыі”, „ініцыятывамі” і „правамі чалавека”? Трэба сказаць, што тут было і ёсць шмат станоўчага, але, на жаль, — пабочнага. Бо галоўную ідэю, якую прынесла сюды лібэральная Эўропа і якую ўкопвае тут з упартасьцю, вартай лепшага ўжываньня, — гэта ідэя *дэмакратыі бяз нацыі*.

Такая пазыцыя, як аказалася, сумяшчаецца з паняцьцем дзяржаўнага суверэнітэту А. Лукашэнкі (як суверэнітэту, таксама — бяз нацыі). І ў Лукашэнкі, і ў эўрапейскіх лібэралаў беларуская культура, беларуская мова і беларуская нацыя аказываюцца аднолькава непатрэбнымі.

Былы кіраўнік Місіі АБСЭ ў Менску Ганс-Георг Вік падтрымліваў антыбеларускую палітыку Лукашэнкі, і нават адкрыта, у нахабнай форме, прылюдна выказваў свае нэгатыўныя адносіны да беларускай мовы.

Ганс-Георг Вік таксама супрацоўнічаў з рэжымам Лукашэнкі па шмат якіх пазыцыях, але найбольш — па пытаньнях легітымізацыі існуючай незаконнай улады (парляманцкай і прэзыдэнцкай) і ў галіне ўключэньня Беларусі ў склад Расеі (пра што сам прылюдна сказаў).

Менавіта Гансу-Геогу Віку і нямецкім дзеячам удалося зрабіць на Беларусі (разам з Масквой) тое, чаго наўрад ці дамаглася б Расея ўадзіночку. У выніку стараньняў Масквы і кіраўніцтва менскай Місіі АБСЭ, у Беларусі быў раздроблены Нацыянальна-Вызвольны Рух, расколаты Беларускі Народны Фронт і галоўнае — створана трэцяя сіла: апазыцыя на эўра-лібэральных прынцыпах дэмакратыі бяз нацыі, што прадугледжвала Беларусь — без беларускай мовы, і ў пэрспэктыве — Беларусь без беларусаў.

У новую, так званую „аб’яднаную апазыцыю” сабралі былых актывістаў з каманды і структураў Лукашэнкі, былых прадстаўнікоў савецкай партыйнай намэнклятуры. Сюды ўвайшлі камуністы, лібэралы, сацыял-дэмакраты, партыі, створаныя спэцслужбамі (лібэральныя дэмакраты) і частка БНФ, якая, у выніку інсьпіраваных маніпуляцыяў, адкалолася ад Народнага Фронту. Гэтая „апазыцыя” адкрыта арыентуецца на Маскву. (Мяркуюць, між іншым, пра аўстрыйскі прыклад, калі мова, маўляў, адна — нямецкая, — а дзяржавы розныя.)

Несамастойнасьць і фактычная антынароднасьць гэтай вікаўскай „аб’яднанай апазыцыі” — відавочныя і не патрабуюць нават дэталёвага разгляду. Найбольш шкоднае дзеяньне, зробленае ў апошні час, — удзел у выбарах прэзыдэнта ў 2001 годзе па сцэнары і па пляну Масквы-Бэрліна; потым — у заплянаваным правале гэтых выбараў, і ўскосна — ва ўмацаваньні ўлады Лукашэнкі.

Практычна, спадару Віку і Маскве ўдалося ажыцьцявіць у Беларусі мару спэцслужбаў — стварыць сваю, ручную, кантралюемую апазыцыю і ўсталяваць у краіне кіруемы канфлікт. Марыянэткавы ня толькі кіраўнік выканаўчай улады, але і ягоная „апазыцыя”, а ніткі — у руках адзінага лялькавода.

Як толькі была створана новая „апазыцыя”, уся ўвага Масквы, Захаду і залежнага друку была пераключана толькі на яе, а ўсё, што зьвязанае зь беларускім Адраджэньнем і нацыянальна-дэмакратычным рухам, — ігнаруецца. Гэтак узьнікла вырабленая імітацыя палітычных паводзінаў і апазыцыйная фальш, якая перашкаджае ў нацыянальнай кансалідацыі беларускага грамадзтва на барацьбу за незалежнасьць і на змаганьне з антынародным рэжымам.

Істотна адзначыць, што Беларусь ужо, практычна поўнасьцю, пазбаўленая перыядычнага беларускага нацыянальнага друку ў беларускай мове. Астатнія сродкі масавай інфармацыі альбо ў руках рэжыму, альбо ў руках чужых спэцслужбаў (так званы „незалежны” друк на рускай мове).

У гэтакім становішчы дэзыарыентаванага грамадзтва здзяйсьняецца падрыхтоўка анэксіі. Фактычна, адбываецца фізічнае і духоўнае вынішчэньне беларускай нацыі. Тут скарыстоўваецца і Чарнобыльская трагедыя, і адміністрацыйны рэсурс, і эканамічны ціск, і афіцыйная медыцына, і мас-культура, і мас-мэдыі, і суды, і дэзінфармацыя, і школа, і міліцыя, і алькаголь, і шкоднае заканадаўства, і нават крымінальны сьвет.

Паўстае пытаньне: як з гэтым усім вынікова змагацца.? Як ўратаваць дзяржаву, нацыю, мову, культуру, маёмасьць, людзей, моладзь ды незалежнасьць, калі ў грамадзтве такая блытаніна, калі нацыянальна-вызвольны рух аслаблены, а Масква і Бэрлін каардынуюць свае дзеяньні супраць Беларусі?

На мой погляд, усім беларусам трэба, перш за ўсё, — супраціўляца палітыцы інтэграцыі і забору. Хоць справай, хоць словам, хоць відам ці поглядам, хоць сымвалічна, але — супраціўляцца. Гэта стварае атмасфэру супраціўленьня ў грамадзтве.

Патрэбна вызначыць галоўнае і сканцэнтравацца на ім. Такім галоўным зараз зьяўляецца абарона незалежнасьці. На ахове незалежнасьці цяпер трэба кансалідавацца беларускаму грамадзтву.

Тут будзе розны ўзровень разуменьня, але неабходна ўлічыць, што ў тых, хто адстойвае незалежнасьць Беларусі, узьнікае глыбейшае ўсьведамленьне нацыянальных каштоўнасьцяў, існаваньне якіх забясьпечвае суверэнітэт. Менавіта: нацыянальнай уласнасьці і маёмасьці, тэрыторыі і межаў, функцыі абароны і дзяржаўных структураў, таварнага рынку і працы, фінансаў і нацыянальнай валюты і, нарэшце, — мовы, культуры і адукацыі.

Менавіта на абароне незалежнасьці трэба разьвіваць салідарнасьць грамадзтва. Але неабходна ісьці глыбей, да шырэйшага разуменьня нацыянальных каштоўнасьцяў, бо толькі Беларуская Нацыянальная Ідэя, разьвіваючыся ў грамадзтве, можа агулам скансалідаваць усю нацыю.

У беларускім заканадаўстве і праве няма (не закладзена) магчымасьці страты ці абмежаваньня суверэнітэту краіны. Што б хто ні рабіў супраць незалежнасьці Беларусі, гэта будзе антыпраўны, антызаконны акт. Тым часам на абарону суверэнітэту ня толькі мае права, але і абавязаны паўстаць кожны грамадзянін Беларусі і бараніць яго ўсімі сродкамі.

Падрыхтоўка анэксіі і адкрыты ціск на Беларусь з боку Расеі, каардынацыя такіх дзеяньняў з нелегітымным рэжымам Лукашэнкі, гэта ёсьць замах на суверэнітэт Беларусі. Мы можам і мусім у такім становішчы зьвяртацца па дапамогу да міжнароднай супольнасьці.

На маю думку, мы павінны зьвяртацца, перш за ўсё, да краін — гарантаў суверэнітэту Беларусі: Злучаных Штатаў Амэрыкі і Вялікабрытаніі. Тым больш, што трэці гарант суверэнітэту, Расея, парушае гарантыі. (Нагадаю, што ў 1994 годзе Беларусь згадзілася перадаць ядзерную зброю Расеі ўзамен за міжнародныя гарантыі яе суверэнітэту з боку трох краінаў: ЗША, Вялікабрытаніі і Расеі.)

Наступная арганізацыя, дзе можна шукаць разуменьня і падтрымкі, — гэта Арганізацыя Аб’еднаных Нацыяў і яе структуры (тыпу ЮНЭСКА і інш.).

Аднак галоўным суб’ектам суверэнітэту, суб’ектам права, нацыянальнай культуры і палітыкі зьяўляецца сам беларускі народ, беларускае грамадзтва. Да яго трэба найперш зьвяртацца, яго прасіць, яго агітаваць і ў яго патрабаваць.

На мой погляд, адным з важных аспэктаў увагі да беларускага грамадзтва з боку актыўных, арганізаваных і адукаваных беларусаў павінна стаць праца і прапаганда ў сфэры нацыянальнага асьветніцтва.

Ідэя павінна абапірацца на рэальных людзей, што стануць носьбітамі ідэі. Інакш беларускі рух застанецца толькі авангардам нацыі, якой будуць маніпуляваць чужыя сілы.

Гістарычная задача ў тым, каб працэс нацыянальнай кансалідацыі (які ўжо завершыўся) перайшоў бы з пасыўнай у актыўную фазу выяўленьня. Каб вырашаць агульнаграмадзкія задачы, нацыя мусіць быць самасьвядомай і самадастатковай.

*13-14 ліпеня 2002 г.; Вільня* ***Зянон ПАЗЬНЯК***

# КРЫВОЕ ЛЮСТРА

Правінцыйнасьць ёсьць галоўнай прыкметай сучаснай мясцовай журналістыкі (не паварочваецца язык назваць яе беларускай). У нас, практычна, не існуе прафэсійнай аналітыкі, няма майстэрства рэпартажу. Міжнароднай беларускай журналістыкі няма, проста не існуе ў прыродзе: журналісты ня ведаюць моваў, не арыентуюцца ў культурных і палітычных працэсах, што адбываюцца ў іншых краінах. Такое ўражаньне, што яны пасканчалі аддзяленьне для раёнак на журфаку (было там такое; ці ёсьць цяпер — ня ведаю). Ну вось, напрыклад, трапляе менскі журналіст зь „Беларускай маладзёжнай" у Парыж, шпацыруе, рапартуе чытачу на радзіму пра свой шпацыр. Чытаем эфэктную канцоўку (канешне ж, напісана па-расейску): „А на Триумфальной арке Наполеона написано — Бородино. Имя подмосковной деревеньки взволновало и перенесло на мгновение домой..."

Я даўно забыўся прозьвішча аўтара, але дагэтуль нашу ў памяці гэты няўклюдна зьлеплены сюжэцік як хрэстаматыйны прыклад збачэнскай арыентацыі і прафэсійнай сьлепаты. На Трыумфальнай арцы ў Парыжы сярод тапонімаў і гідронімаў, якія ўславіліся перамогамі і трагедыямі напалеонаўскіх войнаў, золатам накрэсьленыя беларускія імёны — ***Новы Сьвержань, Полацк, Бярэзіна***... А ў менскага рэпарцёра засьціла вочы, ён хвалюецца зь іншае нагоды. Нельга сабе ўявіць, каб такое ў Парыжы здарылася, скажам, з польскім журналістам. Той адразу пабяжыць паведамляць чытачам пра стан помніка *Адаму Міцкевічу* працы знакамітага французкага плястыка *Бурдэля*.

Пераважная частка журналістаў вызначаецца вузкасьцю погляду на сучаснасьць. На агульным сумным фоне прыемным выняткам з правіла глядзіцца ***Аляксандар Старыкевіч***. „Нелюбімыя" мной журналісты таксама, бывае, часам даюць нечакана добрыя матэр'ялы. ***Алесь Сіліч*** у „*Народнай Волі"*, напрыклад, надрукаваў нядаўна яркую нізку рэпартажаў з Бэльгіі. Так, выключэньні ёсьць, але ўсё ж пануе агульная шэрасьць. Мне ёсьць з чым параўноўваць. У далёкім юнацтве, калі вучыўся ў Пецярбургу, даводзілася сябраваць з творчай моладдзю, што прыехала ў імпэрскую паўночную сталіцу з усіх абшараў на журфак унівэрсітэта. Якая была арыгінальнасьць думкі, імклівасьць рэакцыі, уменьне рызыкаваць.

Пасьля вяртаньня ў родную Беларусь мяне ўразіла савецкая правінцыйнасьць бээсэсэраўскай журналістыкі, проста невылечная правінцыйнасьць, абмежаванасьць у хаўрусе з самазамілаваньнем і пыхай. Думаў, так будзе вечна. І вось грымнула наша рэвалюцыя. Журналісты былі побач з намі на акцыях, спазналі рэпрэсіі, мы пабачылі іхнія акрываўленыя галовы пад міліцэйскімі палкамі. Газэтнае жыцьцё напружана пульсавала, публіка зачытвалася.

Аднак, недзе з 1996 года ў беларускай журналістыцы адбываюцца амаральныя працэсы. „Майстры" пяра груба парушаюць прафэсійны кодэкс гонару. Звычайнымі сталіся ганебныя справы: дэзінфармацыя, замоўчваньне падзеяў. Так званыя „незалежныя" выданьні ствараюць дыстортную, скрыўленую, неадэкватную карціну рэчаіснасьці. Фактычна, груба ашукваюць ня толькі беларускае грамадзтва, але таксама й замежны сьвет. Яны актыўна ўдзельнічалі і ўдзельнічаюць цяпер у подлых апэрацыях, якія вядуць антыбеларускія сілы ў рамках інфармацыйнай вайны супраць Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху, супраць Беларусі. Дастаткова ўспомніць, як яны актыўна ляпілі гарбушку з „адзіным кандыдатам" на прэзыдэнцкіх выбарах.2001 г. Як разгарнулі гераічны іканастас з асобаў, якія ўславіліся выключна як верныя лёкаі Лукашэнкі, што актыўна ўдзельнічалі ў стварэньні і функцыянаваньні антынароднага рэжыму, а вытураныя гаспадаром, сталіся „аб'яднанай апазыцыяй": Чыгір, Лябедзька, Домаш...

Найбольш яркае самараскрыцьцё прадажнай і хлусьлівай журналістыкі мы назіраем у адлюстраваньні тэмы Курапатаў. Створаны міф пра „маладых валанцёраў", якія нібыта абаранілі сьвятыню, міф пра „камітэт абароны", які вызначыўся перш за ўсё пратэстамі супраць крыжаўздзьвіжаньня ў Курапатах і супрацоўніцтвам з арганізацыямі-крэатурамі КГБ. Дзейнасьць сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, якія засланілі сабой Курапацкую сьвятыню, церпяць ад рэпрэсіяў, ствараюць Народны Мэмарыял, падвяргаюцца шальмаваньню — у лепшым выпадку проста замоўчваецца. Ганьба!

У чым жа прычына такога прыкрага рэгрэсу цэлага падвіду творчай інтэлігенцыі нашай краіны? Адказ адназначны — у звычайнай карупцыі, прадажнасьці. Проста зьдзіўляе аднагалосіца, наладжаная зрэжысіраванасьць трактоўкі палітычных працэсаў у Беларусі на балёнках прэсы, падпарадкаванай расейскім і нямецкім сілам, якія дыктуюць сваю антыбеларускую ролю. „Наша Свабода" на вачах пераўтварылася ў карыкатуру на тое, што было пры стваральніку газэты сьветлай памяці *Ігару Гермянчуку.* Дзіўныя публікацыі зьяўляюцца ў „Народнай Волі". „Белорусская газета" і „БДГ" — адкрыта антыбеларускія выданьні. Бачна, як „з адной бочкі" разьліваецца дэза па іхніх балёнках. Грамадзтва дэзарыентаванае, заблытанае. Пустышкі ў выглядзе „ланцугоў неабыякавых людзей", „зуброў" ды драчукоў з шчукінымі засланяюць сабой страшныя працэсы здачы нашай дзяржавы ў маскоўскі палон (пра гэта або ані слова, або з антыбеларускіх пазыцыяў).

Нездарма сумнавядомы Ганс Вік утварыў на тэрыторыі свайго нямецкага цэнтру ў Менску „журналісцкі клюб", раздаваў грашовыя прэміі, па колькі разоў арганізоўваў для паслухмяных стажыроўкі ў Нямеччыне. Ідуць гранцікі, уліваньні праз фонды. Журналісты становяцца цацкамі ў руках тых, хто дае грошы. Расейскія грошы таксама здаўна актыўна ўліваюцца ў мясцовыя СМІ (быў нават фонд „Восток-Запад"). Гледзячы на гэты шабас збоку, цяжка нават часам разабрацца, дзе канчаецца дзейнасьць спэцслужбаў і пачынаецца СМІ.

У недалёкай будучыні адкрыюцца таямніцы інфармацыйнай вайны супраць Беларусі. Стануць вядомыя імёны і цёмныя справы яе арганізатараў і выканаўцаў. Баюся, што такую зьяву, як беларуская журналістыка, давядзецца ствараць нанова.

*Ліпень 2002 г.* **Валеры БУЙВАЛ**

# ДАЛЁКАЯ І ЦЯЖКАЯ ПАРА

*(Гутарка зь Янінай Каханоўскай)*

*Спадарыня Яніна Каханоўская добра вядомая на эміграцыі асоба. Цяпер ёй 94 гады. Амаль уся гісторыя XX-га стагоддзя прайшла перад яе вачыма.*

*Паходзіць яна з роду Шабуняў — беларускай гэрбавай шляхты (гэрбу „Бабёр на камені"), што жылі пад Мар'інай Горкай (маёнтак Шаромысьль). Бацька яе — Аляксандар Апалінаравіч Шабуня, а маці — Амілія Луцкевіч — гэта родная сястра знакамітых братоў Івана і Антона Луцкевічаў, якія прыходзіліся ёй роднымі дзядзькамі.*

*Да сярэдзіны 40-х гадоў спадарыня Яніна жыла ў Менску ў доме Луцкевічаў. Памятае шмат падзеяў тае пары. Прозьвішча „Каханоўская" — гэта яе палітычны псэўданім. Сем'і Луцкевічаў і Шабуняў удзельнічалі ў змаганьні з рускім царызмам. Луцкевічы, напрыклад, у падвале свайго дому ў Менску, захоўвалі зброю „рэвалюцыянэраў", а Шабуні перахоўвалі ў сваім маёнтку змагароў з рэжымам.*

*Антон Шабуня, адвакат, родны дзядзька спадарыні Яніны, спрыяў беларускаму змаганьню. Напрыклад, пачынаюцца арышты. Арыштоўваюць беларусаў. Раптам тыя, каго зьбіраліся арыштаваць, зьнікаюць. А гэта Антон Шабуня браў іх у Шаромысьль і перахоўваў. Потым, праз нейкі час, тыя людзі зноў зьяўляліся ў Менску.*

*Родны брат Антона Канстанцін быў „міравым суддзёй”. Ён уцёк ад расейцаў у Заходнюю Беларусь. Потым, калі ў 1939 годзе прыйшлі туды бальшавікі, яны забілі Канстанціна Шабуню.*

*Маёнтак Шаромысьль знаходзіўся непадалёк ад сядзібы Бонч-Асмалоўскіх — вядомага беларускага змагарнага роду; далей знаходзіліся Дудуткі і іншыя маёнткі. За часы саветаў усё было разрабавана і зьнішчана.*

## *„ЧРЭЗВЫЧАЙКА”*

**З. Пазьняк**: — У гісторыі Беларусі ёсьць вельмі складаныя, вельмі важныя і вельмі заблытаныя чатыры гады чатырох акупацыяў, менавіта: 1917 — 1920.

Вядома мне з друку і газэтаў таго часу пра бальшавіцкія масавыя расстрэлы людзей у лесе пад Менскам па Барысаўскай дарозе. Памятаю нават здымкі адкапаных трупаў. Ці ведаеце Вы пра гэта?

**Я. Каханоўская**: — О, так. Памятаю. Гэта быў 1919 год, калі прышлі бальшавікі. Яны страшна лютавалі ў нас. У Менску расстрэльвалі ўсіх, без разбору. Каго патрапяць. Гэта тады іхняя „чрэзвычайка” рабіла (так называлі ў народзе бальшавіцкую „ЧК” — *З.П.*). Забівалі без суду.

Быў наш знаёмы, Жаба такі. Дык яго бальшавікі з вагона сьцягнулі і тут жа перад цягнікОм расстралялі. Гэта ў іх за звычай было.

Вось, напрыклад, такая Яблонская, недалёка ад нас жыла. Яе сын (19 гадоў) зьнік. А потым знайшла яго ў яме расстраляных.

**З. Пазьняк**: — Дзе была гэтая яма?

**Я. Каханоўская**: — Расстрэльвалі ў Камароўскім лесе. Каго зловяць — заб’юць. Моц людзей пастралялі. Там, у ямах, і засыпалі. Потым, ужо вясной (у гэтым жа годзе), калі пачалася польская акупацыя і палякі занялі Менск, то яны паадкопвалі гэтыя ямы. Людзі хадзілі туды шукаць сваіх, і шмат хто знаходзіў. Гэтая Яблонская якраз там сына свайго і пазнала.

Там вельмі шмат было настраляна. Трупы — адзін пры адным. Мы там і нашага сваяка забітым знайшлі. Яго звалі Людвіг Елец. Быў адвакатам. Мне тады было 11 гадоў, добра яго памятаю. Яны мелі маёнтак Яхімава пад Менскам і нават могільнік свой, побач у лесе. Мяне малую часта забіралі ў гэты маёнтак напаіць малачком з-пад кароўкі. Бо голад жа быў.

Калі раскапалі, то дзядзьку майго, Ельца, знайшлі з зьвязанымі ззаду рукамі, дротам закручанымі, і язык высунуты. То тады думалі (і цётка мая так казала), што ён проста самлеў і ад страху памёр, бо надта баяўся сьмерці. Як прадчуваў.

**З. Пазьняк**: — Тут магло быць, што яго закапалі жывым, і ён задыхнуўся.

**Я. Каханоўская**: — Ай, мажліва, што і жывым. Там жа ня толькі дзядзька, а шмат-шмат людзей пабіта было. Цётка яго ўсё Лютынкам называла.

**З. Пазьняк**: — Дзе гэтае месца і што было потым?

**Я. Каханоўская**: — Потым, калі ўжо бальшавікі аселі на Беларусі, то пабудавалі на тым месцы клінічны гарадок. Гэта ўжо тады, у 30-х.

**З. Пазьняк**: — Цяпер там Першы Абласны клінічны шпіталь, вуліца Падлесная. (Пазьней перайменавалі, здаецца, у вуліцу Пятуся Броўкі.)

**Я. Каханоўская**: — Так, Падлесная, бо некалі лес быў. Я ў гэтай клініцы працавала лябаранткай у скура-вэнэрычным аддзяленьні. У 1939-м, калі савецкія вайскоўцы вярнуліся з Заходняй Беларусі (зь Вільні, адусюль), то прывезьлі сіфіліс у Менск. Бальшавікі паслалі войска, каб выбавіць ад Польшчы, а тыя там ад прастытутак набраліся. Дык Пракапчук страшна злаваўся, аж шалеў. Але ўсё выкарчаваў.

**З. Пазьняк**: — Пракапчук — гэта хто?

**Я. Каханоўская**: — Прафэсар венэрычнага аддзяленьня, у якога я працавала. Дык ён усіх сіфілітыкаў выслаў у Сібір.

**З. Пазьняк**: — Ён што, з бальшавікамі супрацоўнічаў?

**Я. Каханоўская**: — О, так. Йшчэ як! Гэта быў энкавэдзіст, ён задаўся мэтай „іскарэніць сіфіліс”. І „іскарэніў”. Саслаў усіх хворых у Сібір ды на той сьвет — і сіфілісу няма.

**З. Пазьняк**: — Ну, так, паводле бальшавікоў, сьмерць — найлепшае „лякарства” ад усіх хваробаў. Некалі ў савецкай энцыкляпэдыі я прачытаў, што сіфіліс — гэта хвароба, характэрная для буржуазнага грамадзтва. У Савецкім Саюзе — „ізжыта”.

Але вернемся да „чрэзвычайкі”. Што было, калі будавалі клініку, калі капалі катлаван? Як паводзілі сябе будаўнікі?

**Я. Каханоўская**: — Вельмі шмат выкопвалі касьцей, чарапоў людзкіх. Тады сьмяяліся нават. За плотам быў парк „Чалюскінцаў”, так званы. Там, дзе потым Акадэмію Навук пабудавалі. У парку вісеў гучнагаварыльнік, і ўвесь час, цэлы дзень, на ўсю ваколіцу гаварылася пра дасягненьні савецкай „уласьці”, як добра, маўляў, цяпер жывецца. І там ня можна было адпачыць. Увесь дзень была гэтая рэкляма. А тут побач — косьці выкопвалі.



***Дом Луцкевічаў у Менску, 1943 год. На пярэднім пляне Яніна Каханоўская (зьлева) і яе маці Амілія Шабуня з Луцкевічаў.***

**З. Пазьняк**: — І як да гэтага адносіліся?

**Я. Каханоўская**: — Будавалі і маўчалі. Ведалі ўсе: і людзі, і ўлада. Але ўсяроўна будавалі. І ніхто ня вымкнуўся. Баяліся, што арыштуюць і расстраляюць.

Шмат было касьцей. Мы і пазьней знаходзілі, ужо на тэрыторыі шпіталя. І Пракапчук знаходзіў. Вось вам і першыя Курапаты. У цэнтры горада цяперака.

Але нельга, каб усё забылася. Гэтулькі нявінных людзей пазабівалі ні за што.

## *ХРЫШЧЭНСКАЯ ВУЛІЦА*

**З. Пазьняк**: — Цяперака пра мясьціну, дзе да вайны жыў Янка Купала і стаяў дом Луцкевічаў, у якім Вы жылі. У Менскай тапаграфіі — гэта вядомае старажытнае месца, якое спрадвеку называлася *Валокі Полацкія*, а пазьней, ужо ў XVII стагоддзі, калі быў пабудаваны менскі „Дамініканец”, тады тут узьнікла вуліца Валоцкая, якая ад

Дамініканца спускалася ў луку Сьвіслачы. У XIX стагоддзі, ужо пад расейскай акупацыяй, улады перайменавалі яе ў „Хрышчэнскую”. Цяпер гэта кавалачак вуліцы Інтэрнацыянальнай — рэшткі трасы Хрышчэнскай.

(Прыйдзе час, і мы адновім усе беларускія назвы: і Валоцкую, і Валокі Полацкія, і дамы вялікіх людзей.)

**Я. Каханоўская**: — Янка Купала жыў на Хрышчэнскай вуліцы ў доме нумар 40, а наш дом (дом Луцкевічаў) стаяў на другім баку вуліцы пад нумарам 27. У Купалавым доме я бывала часта. Але казаць пра яго ня буду, бо ўсё вядома. Ёсьць шмат здымкаў і апісаньняў.

Што да Луцкевічаў, то мы ўжо тутака зрабілі пляны і малюнкі дому. Гэта ўсё мае Маргарыта, мая пляменьніца ў Менску.

У хаце быў салён, сталовая, спальня, яшчэ асобныя пакойчыкі. Дамок быў невялікі, такі, як тады будавалі: драўляны на падмурку.

**З. Пазьняк**: — На фатаграфіі відаць два дамкі.

**Я. Каханоўская**: — Так. Першы дом — гэта ўжо ў спадку дастаў Луцкевіч. Ён стаяў на зямлі, за якую яму быў вінаваты грошы Плаўскі (гаспадар вядомай у Менску лазьні — *З.П.*). То гэта разам з домам зямля адышла. Дом той быў вельмі стары. І таму пабудавалі іншы. Мая бабка пабудавала ўжо пасьля сьмерці мужа. Бо ў старым жыць было немагчыма.

**З. Пазьняк**: — На фатаграфіі, дзе Вы разам са сваёй маці Аміліяй з Луцкевічаў Шабуняй сфатаграфаваны на фоне дома, ён выглядае вельмі апушчаным.

**Я. Каханоўская**: — Але. За саветамі ня мелі ніякіх магчымасьцяў на рамонт. За немцамі таксама. Між іншым, немцы фатаграфавалі нашыя дамы дзеля прапагандовых мэтаў, каб паказаць, да якога стану давялі бальшавікі жыццё і пабудовы вядомых на Беларусі людзей.

**З. Пазьняк**: — Хто там тады яшчэ жыў?

**Я. Каханоўская**: — Жыў такі Сяржынскі. Ён быў жанаты на дачцы Тодара Лебяды. Потым жыў мой дзядзька, лекар; Марозавы такія і некалькі кватарантаў.

**З. Пазьняк**: — У дзяцінстве, як Вы жылі там, што можаце сказаць пра рэчы і абстаноўку? Ці быў, напрыклад, у доме грамафон?

**Я. Каханоўская**: — Грамафон мы мелі ў Жлобіне, калі жылі там. Бацька працаваў тады на Лібава-Ровенскай чыгунцы. Калі памерла бабуля мая, то бацька пераехаў у Менск. Бо трэба было гэтыя дамы перабіраць. У Менску мы грамафона ня мелі. Тады ўжо былі патэфоны. У хаце стаялі канапы, дзьве печкі зь белай гладкай кафлі (выходзілі на другі бок на некалькі пакояў), сталы, крэслы. Усё гэта ёсьць у нашых малюнках.

Калі ў 1944-м Менск займалі саветы, то на Хрышчэнскай вуліцы згарэў толькі дом Купалы, астатняе ўсё засталося. Але потым бальшавікі ўсё пабурылі, і нашыя дамы таксама. Цяпер там пустка, траўнік у парку каля Літаратурнага музэю Янкі Купалы.

## *АКУПАНТЫ*

**З. Пазьняк**: — Гадоў 25 таму, мне надарылася размаўляць з адным старым менскім габрэям па прозьвішчу Сьляпян. Гэты Сьляпян добра памятаў 1919-ы год (ён меў тады гадоў 13) і расказваў мне фантастычныя дзіўныя выпадкі. Напрыклад, казаў, што калі пачалася польская акупацыя і палякі зайшлі ў Менск, то пачалі лютаваць і быццам бы вешаць людзей; што ўздоўж Захараўскай вуліцы на кожным тэлеграфным слупе быў павешаны чалавек.

**Я. Каханоўская**: — Я ня бачыла ніводнага павешанага і ня чула, каб пра гэта хто гаварыў. Можа, ён пераблытаў што з бальшавікамі (тыя расстрэльвалі). Немцы (кайзераўцы) таксама ня вешалі нікога і не расстрэльвалі. Такога ня памятаю і нічога дрэннага пра тых першых немцаў сказаць не магу.

Я ж добра памятаю 1918 год, калі яны знаходзіліся ў Менску. Гэта былі ціхія культурныя людзі. Яны нават, каб дапамагчы менчукам лягчэй перажываць цяжкасьці і каб арганізаваць нейкае крыху лепшае жыцьцё, дык у суботы-нядзелі ставілі аркестры, і тыя гралі для жыхароў усялякую добрую музыку. Гэта ў скверыках, каля тэатраў.

Пра нямецкія жорсткасьці мы нічога ня чулі. Яны самы галодныя сядзелі. Гэта ж голад быў тады. Елі хлеб з асьцюкамі і колькі грамаў павідла такога, з буракоў. Гэта ж самае атрымліваў кожны жыхар Менска.



(Фота А. Сільвановіча)

*Спадарыня Яніна Каханоўская, 1998 г.*

**З. Пазьняк**: — Немцы разьмяркоўвалі?

**Я. Каханоўская**: — Так, па картачках. Голадна жылося. Але парадак і чысьціню ў горадзе трымалі. Памятаю, што яны былі ветлівымі і стараліся трымацца правілаў.

**З. Пазьняк**: — Тым ня менш, нямецкае войска так абрабавала тады Беларусь, што пачаўся голад, чаго на Беларусі ніколі не было, бо беларусы да голаду стараюцца не дапусьціцца.

**Я. Каханоўская**: — Вельмі складаны быў час. Мне за ўсё сказаць цяжка. Я тады была падлеткам. Але людзей, атмасфэру — памятаю. Тых, нармальных немцаў, што былі ў 18-м, нельга параўнаць з другімі немцамі, што прыйшлі ў 41-м. Яны былі ўжо іншыя. Гэта не да параўнаньня, як людзі могуць зьмяніцца. Тады, раней, гэта быў нямецкі народ. Пагналі Вільгельма. Але гэта яшчэ былі не пазьнейшыя немцы. А Гітлер — зьява асобая. Тут што фашызм, што бальшавізм — аднолькава.

От як па немцах прышлі расейцы-бальшавікі, зімой, у самым канцы 18-га (гэта значыць, другія бальшавікі, першыя — у 1917-м — *З. П.*), тут ужо пачаўся сапраўдны кашмар. Бандытызм, сьмецьце, бруд, расстрэлы, — і ўсё гэтая іхняя лаянка і крык.

Потым, калі ў Менск (вясной) прышлі палякі, то менчукі ўздыхнулі пасьля бальшавікоў. Палякам шмат спрыяла Амэрыка, прысылала прадукты, пасылкі (АРА — такая арганізацыя дапамагала), было што есьці. Людзі ўжо так не галадалі. Спыніліся забойствы і хамства.

Але на працу было ўладкавацца цяжка, бо трэба было ведаць польскую мову, каб працаваць. Такі яны ўстанавілі свой парадак. Але што цікава, менскія габрэі неўзабаве ўсе пачалі гаварыць па-польску.

**З. Пазьняк**: — Мне некалі расказваў Апалінары Пупко, найвядомейшы народны разьбяр і майстра зь Івянца (ужо не жыве),

што як толькі ў 1939 годзе прыйшлі рускія бальшавікі, то івянецкія габрэі тут жа пабеглі да іх і адразу загаварылі па-руску. Мабільны народ. Жыцьцё навучыла (дакладней, патрэба ў выжываньні).

**Я. Каханоўская**: — Пасьля палякаў (гэта ўжо ў 20-м) прыйшлі трэція бальшавікі. Ну, то гэта ўжо зноў кашмар вярнуўся. Усё зьнікла. Есьці не было чаго. Потым пачаўся НЭП і БССР, гэта такая мясцовая палітыка. Тады трошкі палягчэла. Можна было нават сёе-тое купіць. Можна было, напрыклад, два разы стаць у чаргу па масла. За адзін раз давалі (гэта значыць, прадавалі) па сто грамаў на чалавека. Пабяжыш хуценька другі раз, станеш — яшчэ сто грамаў дастанеш. І гэта было шчасьце.

А як скончыўся НЭП, тады ўжо нельга было два разы стаць. Нічога не было. Жылі пад Сталінам.

**З. Пазьняк**: — Мне расказвалі эстонцы, што як прыйшлі бальшавікі ў Эстонію, то скрозь толькі і было чуваць: „очередь", „очередь" і „в очередь". Не разумеючы расейскай мовы, эстонцы казалі пра расейцаў: „Вось прыехалі „товарищи в очередь".

А як было з рэпрэсіямі?

**Я. Каханоўская**: — Арышты былі і ў 20-х. Але ўжо сапраўднае пекла пачалося ў 30-х гадах. Хапалі, вывозілі і расстрэльвалі.

У 1941 годзе (як потым высьветлілася) усе мы таксама былі ў сьпісе на вываз у Сібір, уся наша сям'я. І вывезьлі б, каб не пачалася вайна. Пару дзён усё вырашылі. Каб вайна пазьней — то й канец. Выходзіць, што нас як бы немцы „выратавалі". Гэтакі парадокс.

От так і жылі: ад акупацыі — да акупацыі. Зьмяняліся толькі навалы.

***(Запісана ў Нью-Ёрку 14 траўня 2002 года і да друку падрыхтавана Зянонам Пазьняком)***

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ЛІСТАПАД* (2001 год, працяг)

*4 лістапада ў Воршы* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* правялі мэмарыяльны мітынг на Кабылянскай гары, дзе расейскія бальшавікі расстрэльвалі беларусаў. Ксёндз *Яраслаў* адправіў імшу. Выступілі сябры Партыі БНФ. На пачатку 90-х гадоў на гэтым месцы быў усталяваны невялікі помнік — камень з мэмарыяльнай шыльдай. Шыльду ўжо зьдзерлі вандалы. Удзельнікі мітынгу пастанавілі аднавіць шыльду. Людзі маліліся, ускладалі на магілы кветкі і вянкі. Над імі луналі *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі*.

*5 лістапада.* Настаўнік фізікі і матэматыкі ***Леанід Сьвецік*** мае 12 гадоў настаўніцкага стажу, навуковыя працы і лічыцца ў раёне вопытным і дасьведчаным педагогам. Ён быў на 1 месяц запрошаны адміністрацыяй Крычаўскай сярэдняй школы №5 дзеля выкладаньня фізікі. Аднак ужо на сярэдзіне другой лекцыі, якую вёў настаўнік, у школу прыехаў загадчык раённага аддзелу адукацыі Крычаўскага райвыканкаму **М. Мазок** і забараніў настаўніку прафэсійную дзейнасьць. Ён быў выгнаны з клясу проста пасярод лекцыі. Прычынай паслужыла тое, што сп. Сьвецік кіруе грамадзкай арганізацыяй, якая залічана мясцовай уладай у шэраг „апазыцыйных".Лекцыя фізікі ў 8"б" клясе так і засталася няскончанай.

*3-8 лістапада ў Віцебску* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* усталявалі крыжы на месцах пакутніцтва беларусаў. Адзін крыж — побач з Вэтэрынарнай акадэміяй, у рове, дзе перад вайной расейскія бальшавікі (а падчас вайны нямецкія фашысты) расстралялі сотні беларусаў. Другі крыж усталявалі побач з амфітэатрам „славянскага базару". Крыжы асьвяціў грэка-каталіцкі сьвятар айцец *Зьміцер.* Крыж каля амфітэатра ўлады зьнішчылі ўжо 8 лістапада.

*8 лістапада. <u>КУРАПАТЫ</u>.* На шляху будаўнікоў Менскай кальцавой дарогі, якая павінна прайсьці па касьцях бязьвінных ахвяраў, паўсталі дзясяткі крыжоў, устаноўленых грамадзянамі.

Антынародны рэжым Лукашэнкі распачаў сілавы наступ на *Народны Мэмарыял Курапаты.* Ранкам 8 лістапада ўлады накіравалі сюды дзясяткі бульдозераў і гарылаў ОМОН (расейская назва „отряд милиции особого назначения") на ламаньне устаноўленых тут крыжоў. Некалькі дзясяткаў фронтаўцаў (сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* і *Маладога Фронту*) і іншых асобаў, што былі ў гэты час у Курапатах, паўсталі на абарону крыжоў.

Пачаўся наступ бульдозераў на крыжы. Сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімер Юхо*** і ***Рыгор Кійко*** кінуліся бараніць крыжы. Амонаўцы павалілі іх на зямлю, адмыслова мучылі і зьбівалі. (У гэтым годзе (18 траўня) у час мірнай дэманстрацыі, „гарылы ОМОН" зламалі спадару *Юхо* рэбры і руку.)

Спадара *Кійко* гарылы павалілі на зямлю, заламалі рукі і тапілі ягоную галаву ў лужыну, поўную гразі, каб ён ня мог дыхаць і захлынаўся. Напоўпрытомнага, яго білі дубінкамі ў грудзі і таптылі нагамі. Ужывалі дзікі мэтад катаваньня, моцна ціснучы дубінкай у вобласьць сэрца. (Агульнавядома, што такія катаваньні выкарыстоўваў рускі НКВД падчас тэрору супраць акупаваных народаў Савецкага Саюзу.)

Супраць абаронцаў Курапатаў быў ужыты сьлезацечны газ. Зьбілі і затрымалі некалькі дзясяткаў чалавек. Пры гэтым людзей тут жа катавалі, зыходзячы зь меркаваньняў нянавісьці да ўсяго беларускага. Зьбівалі нагамі і дубінкамі.

***Яраслаў Сьцешык*** сваім целам імкнуўся абараніць адзін з крыжоў. „Людзі ў цывільным" павалілі яго на зямлю. Білі нагамі, потым начапілі на рукі кайданкі і нацягнулі на галаву капюшон, каб не было бачна твару.

Навокал у ачапленьні стаялі амапаўцы. Самазвалы пачалі падвозіць пясок, а бульдозеры ламаць і засыпаць крыжы. Больш за 200 узброеных дубінкамі служкаў рэжыму хапалі абаронцаў, цягнулі іх па зямлі, кідалі тварам у гразь, зьбівалі нагамі... Амапаўцы ня бачылі розьніцы паміж хлопцамі і дзяўчатамі, дзецьмі і дарослымі. Тых, хто падаў, зьбівалі нагамі і дубінкамі, а тых, хто заставаўся на нагах, сьпіхвалі ў кювет. ***Сяржуку Лісічонку*** разьбілі галаву. Акрываўлены, ён быў дастаўлены ў шпіталь №4. Былі затрыманыя ***Аляксандар Атрошчанкаў***, ***Вячаслаў Валадзько***, ***Юры Фабішэўскі***. Арыштавалі 20 чалавек. Бульдозерамі былі раструшчаныя намёты абаронцаў Курапатаў. Амапаўцы ўжылі сьлезацечны газ. Юнак, якога завуць ***Глеб***, атручаны газам, ня быў у стане назваць сваё прозьвішча. Яго адправілі ў шпіталь на „хуткай дапамозе". Яшчэ адзін хлапец, зьбіты гумавай дубінкай да страты прытомнасьці, сьцякаў крывёю. Яму таксама выклікалі „хуткую дапамогу". Былі зьбітыя да крыві ***Насьця Карповіч*** (яе павезьлі ў шпіталь), журналістка ***Натальля Радзіна*** і іншыя. Усіх даставілі ў РАУС Менскага раёну, дзе склалі на іх пратаколы за „непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі і парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў".

Дзеяньнямі па зьнішчэньні крыжоў і пахаваньняў, па затрыманьні і зьбіцьці людзей кіраваў выконваючы абавязкі начальніка РУУС Менскага раёну **Абакунчык**.

Злачынства і дзеяньні лукашэнкаўскіх уладаў у Курапатах уразілі міжнародную супольнасьць. Пра тое, як зьнішчалі крыжы, зьбівалі людзей, паказалі буйнейшыя тэле-кампаніі сьвету.

*9 лістапада.* Падчас начнога дзяжурства (з 8-га на 9-е), замест па-варварску зьнесеных крыжоў, былі ўстаноўленыя 15 новых.

*9 лістапада, Менск.* Раніцай (каля 10 гадзінаў) міліцыя і спэцаддзелы ланцугом рушылі на абаронцаў Курапатаў, разбуралі магілы і крыжы. Амонаўцы затрымалі шэраг сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Сярод затрыманых — сакратар Партыі ***Уладзімер Раманцоў***. Затрымалі яшчэ 11 чалавек.

Праз дзьве гадзіны ***Сяргей Папкоў***, ***Уладзімер Юхо*** і іншыя

абаронцы перакрылі дарогу, каб будаўнічая тэхніка не магла зьнесьці крыжы. Было затрымана яшчэ 5 асобаў.

Як сьведчаць тыя, хто знаходзіўся ў міліцэйскім пастарунку, амапаўцы зьбівалі ***Яраслава Сьцешыка*** і ***Юры Фабішэўскага***. Амапавец зь мянушкаю „Хатаб" біў нагамі па галаве. На затрыманых былі складзеныя пратаколы па арт. 166 КаАП (непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі).

Усяго ў гэты дзень было затрымана каля 30 чалавек (многія зь іх — паўторна, пасьля 8 лістапада). Сярод іх — ***Сяргей Папкоў***, ***Рыгор Кійко***, ***Уладзімер Юхо***, ***Валеры Буйвал***, ***Уладзімер Раманцоў***, ***Яраслаў Сьцешык***, ***Уладзімер Плотнікаў***, ***Павел Севярынец***, *сп.**Парфёнаў***, ***Лявон Садоўскі***, ***Мікалай Вязьмін***, ***Віктар Кавэшнікаў***, ***Цімафей Сугака***, ***Андрэй Будзько***, ***Вячаслаў Сіўчык***, ***Хведар Жывалеўскі***, ***Андрэй Ягораў***, ***Аляксандар Цялегін***, ***Генадзь Дранковіч***, ***Павел Юхневіч***, *сп.* ***Навасенкаў***, ***Яўген Афнагель***.

*9 лістапада* ў судзе Маскоўскага раёну Менска пачаліся суды над затрыманымі. ***Уладзімер Юхо*** атрымаў штраф *(5 мінімальных заробкаў)* і папярэджаньне. Пратаколы на ***Віктара Кавэшнікава*** і ***Ўладзімера Плотнікава*** накіраваны на дапрацоўку.Суды над *Паўлам Севярынцам, Вячаславам Сіўчыкам, Цімафеем Сугакам, Лявонам Садоўскім, Хведарам Жывалеўскім* перанесеныя.

*9 лістапада ў Сьветлагорску* выкладчыкам беларускіх ліцэйскіх клясаў ня выплачаны заробак за кастрычнік.

*9 лістапада* раніцай непадалёк ад станцыі мэтро *Кастрычніцкая* мусіў адбыцца пікет Беларускага Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў з мэтай патрабаваньня рэгістрацыі першасных арганізацыяў. Адказу з Менгарвыканкаму на пададзеную заяўку прадстаўнікі свабодных прафсаюзаў так і не атрымалі, але ў прызначаны час сабраліся. Міліцыя затрымала 7 чалавек (*Віктара Бабаеда, Уладзімера Макарчука, Алену Калініну, сп. Фаміна* і інш.).У гэты ж дзень адбыліся суды. Прысуд: ***Уладзімер Макарчук** — штраф у 200 мін. зароб.;* ***Віктар Бабаед*** і *сп.* ***Фамін** — штраф у 20 мін. зароб.кожны.* А *12 лістапада* суд вынес папярэджаньне ***Алене Калінінай***.

*12 лістапада* Вышэйшы Гаспадарчы суд пад кіраўніцтвам суддзі **В. Жандарава** пастанавіў спыніць дзейнасьць адзінай беларускай газэты *„Пагоня"*, што выдавалася ў Горадні, і спыніць існаваньне яе рэдакцыі як юрыдычнай асобы. Хадайнічала аб закрыцьці газэты пракуратура Горадзенскай вобласьці, якая ў сваім зыску сцьвярджала, што падставай для закрыцьця газэты і ліквідацыі рэдакцыі сталі „неаднаразовыя парушэньні газэтай заканадаўства аб друку". (На чалавечай мове гэта значыць, што *„Пагоня"* пісала праўду пра Лукашэнку і ягоны рэжым. Рашэньне матываванае палітычнымі прычынамі і „заказам" рэжыму.)

*12-14 лістапада* ў судзе Менскага раёну разглядаліся адміністрацыйныя справы сябраў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, якія былі затрыманыя міліцыянтамі падчас абароны крыжоў ў Курапатах 8-9 лістапада. У якасьці сьведкаў, як заўсёды, выступалі самы міліцыянты, якія блыталіся ў паказаньнях, хлусілі і паклёпнічалі. Нягледзячы на бяздоказнасьць абвінавачваньняў, суддзя **А. Тачкар** прысудзіў штрафы: ***Рыгору Кійко*** і ***Віктару Кавэшнікаву*** па 20 мінімальных заробкаў, а сакратару Управы БНФ ***Валеры Буйвалу*** — 30 мінімальных заробкаў. ***Лявон Садоўскі*** і ***Цімафей Сугака*** таксама атрымалі штрафы па 20 мінімальных заробкаў. Кіраўнік *Маладога Фронту* ***Павел Севярынец*** атрымаў 10 сутак адміністрацыйнага арышту, а ***Фёдар Жывалеўскі*** — 7 сутак арышту. ***Вячаслаў Сіўчык*** — справа спыненая.

Суд Савецкага раёну Менска прысудзіў ***Яўгену Клімаву*** штраф у 7 мінімальных заробкаў.

*13 лістапада, Ваўкавыск.* Улады праз адміністрацыю Музэя забаранілі выставу карцін на гістарычную тэму мастаку ***Зтміцеру Іваноўскаму***. Існуе цэнзура. Улады кантралююць выставачныя залі. Кожны дырэктар музэю або галерэі баіцца зрабіць няслушны крок; усе перастрахоўваюцца. Так у Горадні не дазволілі адкрыць выставу кавалю ***Юры Мацко*** ў Дзень 25 Сакавіка 2001 г., а перад тым улады спрабавалі выселіць яго з майстэрні.

Раней праз суд пазбавілі майстэрні мастака ***Алеся Сурава***; паўгода таму вымушана адмовіўся ад майстэрні і сам *Зьміцер Іваноўскі.* (У траўні ўлады прапанавалі яму плаціць за памяшканьне 160 даляраў у месяц, і заплаціць — мінулым днём, з пачатку года.) Цяпер ён малюе ў падвальных сутарэньнях.

Да нядаўняга часу ягоная карціна з выявай гораду аздабляла фае Гарвыканкаму, яшчэ некалькі карцін віселі ў чыноўніцкіх кабінэтах. Але пасьля выступу мастака на апазыцыйным мітынгу усе карціны зьнялі і схавалі.

*14 лістапада.* Без тлумачэньня прычынаў быў забаронены і зьняты з рэпэртуару Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы спэктакль ***„Тутэйшыя" Янкі Купалы***, які ўвесь час ішоў з аншлагам. Гледачам прапанавалі здаць білеты ў касу, альбо глядзець нейкую расейскую п'есу. Прычыны забароны агульныя — вынішчэньне беларускага.

*15 лістапада* ў Менску (на плошчы Бангалёр) 10 актывістаў *Маладога Фронту* правялі пікет супраць парушэньняў нормаў эўрапейскае палітыкі ў Беларусі, супраць парушэньня свабоды слова (закрыцьцё беларускай газэты *„Пагоня"*. Яны трымалі плякаты: „Свабодная Беларусь у свабоднай Эўропе!", „Свабоду слова на Беларусі!"

*16-18 лістапада ў Менску* працягваліся суды над затрыманымі падчас пратэсту ў Курапатах 8-9 лістапада. Вынесеныя прысуды: ***Мікалай Вязьмін*** — штраф у памеры 30 мінімальных заробкаў (мін. зароб.); ***Аляксандар Цялегін*** — штраф (10 мін. зароб.); ***Мікалай Валадзько*** — штраф (5 мін. зароб.); ***Андрэй Ягораў*** — штраф (6 мін.зароб.); ***Аляксандар Губейка*** — штраф (10 мін. зароб.); ***Генадзь Дранковіч*** — штраф (6 мін. зароб.); ***Ірына Кашталян*** — справа спыненая з-за адсутнасьці складу правапарушэньня. ***Мікіта Сасім*** — судовае паседжаньне перанесенае.

*19 лістапада ў Менску* адміністрацыя Трактарнага заводу канфіскавала офіс Свабоднага прафсаюза. „Гвалтоўныя дзеяньні палягаюць у рэчышчы агульнадзяржаўнай палітыкі ў дачыненьні да дэмакратычных прафсаюзаў", — паведаміў прафсаюзны лідар ***Вячаслаў Козел***.

Трактаразаводская суполка, у якой зараз 65 сябраў, ужо тры гады спрабуе легалізаваць сваю дзейнасьць на прадпрыемстве. Беспасьпяхова. Як лічыць сп. Козел, незаконныя дзеяньні кіраўніцтва МТЗ (дырэктар **Лявонаў**) ухваляе Партызанскі райвыканкам і ўлада ў цэлым.

*19 лістапада.* Шклоўскі райвыканкам (намесьнік старшыні **В. Лузаў**) забараніў Таварыству Беларускай Мовы і аб'яднанай раённай бібліятэцы адзначыць ***100-годдзе*** *з дня нараджэньня вялікага беларускага пісьменьніка* ***Міхася Зарэцкага*** (расстралянага рускімі энкавэдзістамі ў 1937 годзе). Акупацыйныя чыноўнікі сказалі кіраўніку ТБМ *Аляксандру Грудзінаву*, каб ён „не занімался паліцікай".

***19 лістапада ў Горадні*** на вул. Савецкай адбыўся несанкцыянаваны пікет у абарону закрытай газэты *„Пагоня"*. У акцыі прыняло ўдзел больш за 100 асобаў — журналістаў і чытачоў газэты. Міліцыя затрымала рэдактара газэты ***Міколу Маркевіча,*** журналістаў ***Андрэя Пісальніка*** і ***Паўла Мажэйку***. На іх былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні.

*21 лістапада* ў судзе Савецкага раёну Менска працягваліся суды над абаронцамі Курапатаў. Прысуды: ***Мікалай Ткачэнка*** — штраф 5 мін. зароб.(суддзя **Руслан Казадаеў**); ***Яўген Афнагель*** — штраф 6 мін. зароб. (суддзя **Аксана Рэлява**); *сп.* ***Казакевічу*** і ***Максіму Сасіму*** суды перанесеныя.

*22 лістапада.* Сьвятар з пасёлка *Пагранічны* **Іван Спасюк** два гады таму выйшаў з-пад юрысдыкцыі Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ) на Беларусі. Ён зьяўляецца іярэем Беларускай Народнай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Акднак гэта не перашкодзіла епархіяльнаму сходу РПЦ амаль шэсьць гадзінаў абмяркоўваць яго асобу і

„паводзіны”. Сход склікаў япіскап Арцемій, які патрабаваў пакаяньня за „раскол”, у якім нібыта павінны Іван Спасюк. Епархіяльны суд адбыўся 22 лістапада, але Спасюку нават не паведамілі, дзе і ў які час гэты суд адбудзецца. У сходзе ўдзельнічала блізу 70 сьвятароў і дабрачынных Горадзенска-Ваўкавыскай епархіі. Спрэчкі працягваліся амаль шэсьць гадзінаў. Каля 30 адсоткаў прысутных падтрымалі Івана Спасюка. „Задушыць беларускую аўтакефалію ня ўдасца. На мінулым тыдні да нас перайшоў яшчэ адзін сьвятар. У наступным месяцы таксама будзем праводзіць хіратонію”, — сказаў Іван Спасюк.

*22 лістапада.* Кіраўніка *Маладога Фронту* ***Паўла Севярынца*** перавялі з ізалятара часовага ўтрыманьня РАУС Менскага раёну ў спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік на вул. Акрэсьціна, дзе ён будзе знаходзіцца сем сутак за ўдзел у антыфашыстоўскай акцыі 26 кастрычніка.

*24 лістапада.* Беларускі экзархат рускай праваслаўнай царквы на Беларусі пазбавіў сану іярэя ***Вячаслава Гнядзько***, які ўзначальваў храм у мястэчку *Вызна* на Случчыне. Іярэй Вячаслаў быў у канфлікце зь Мітрапалітам Філярэтам, выступаў супраць гандлю сьвятымі таямніцамі. „Народ навучылі, што царква — гэта гандлёвая палата, — сказаў ён вышэйшай царкоўнай афіцыйнай асобе, — ... за ўваход заплаці, за сьвечку 300 рублёў заплаці, за вянчаньне 150 даляраў заплаці” і г.д.

У сваім доме айцец Гнядзько арганізаваў незалежны ад мітрапаліта храм. Пасьля ягонага зыходу з вызыненскага храму, мясцовыя ўлады (па падказцы і з маўклівай згоды экзархату рускай праваслаўнай царквы) зьнішчылі 8 памятных крыжоў, пастаўленых сьвятаром на царкоўным двары. У тым ліку — крыж па забітых бальшавікамі Слуцкіх збройчых змагарах.

*25 лістапада. Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* і ягоная *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* адзначылі 81-ю гадавіну Слуцкага Збройнага Чыну. Вялікая група фронтаўцаў наведалі мястэчкі *Грозаў, Семежава, Вызна, г.Слуцк*, дзе правялі шэсьце і мітынг, усклалі кветкі ля памятных крыжоў і знакаў, якія былі ўсталяваныя тут у мінулыя гады, запалілі сьвечкі і зьнічы, маліліся, сьпявалі беларускія ваярскія гімны.

Мясцовыя жыхары паўсюдна віталі фронтаўцаў. Да іх далучаліся мясцовыя патрыёты.

Начальнік спэцыяльнай міліцыі Капыльскага райаддзелу УС маёр **Астрэйка** склаў пратакол на адказнага за акцыю ***Уладзімера Раманцова*** (які сп. Раманцоў не падпісаў), абяцаў прыняць „рашучыя меры”.

■ У Слуцку (упершыню за апошнія гады) напрыканцы лістападу краязнаўчы музэй не разгарнуў сваю сьціплую экспазыцыю, прысьвечаную гісторыі Слуцкага Збройнага Чыну. Супрацоўнікі музэю катэгарычна адмовіліся даваць тлумачэньні.

*26 лістапада, Горадня.* Суддзя **Д. Дземчанка** зачытаў прысуды журналістам газэты *„Пагоня”* за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце ў падтрымку *„Пагоні”* 19 лістапада. ***А. Пісальнік*** і ***П. Мажэйка*** атрымалі папярэджаньне.

*27 лістапада* ўначы быў учынены пагром у офісе Свабоднага прафсаюза Менскага Трактарнага заводу.

*28 лістапада*. Рэжым Лукашэнкі працягвае судовыя рэпрэсіі супраць сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* 28 лістапада на кватэры намесьніка страршыні Партыі БНФ ***Міколы Анцыповіча*** зьявіліся судовыя выканаўцы ў сувязі з тым, што Берасьцейскі абласны суд пацьвердзіў прысуд (штраф у памеры 50 мінімальных заробкаў) сп. Анцыповічу. Нагадаем: 22 верасьня сёлета сп. Анцыповіч быў затрыманы беларускімі мытнікамі ў Берасьці, калі вяртаўся з Варшавы. У яго незаконна былі канфіскаваныя вялікая колькасьць часопісаў *„Беларускія Ведамасьці”*, якія выдае ў Варшаве *Зянон Пазьняк,* і падпісаныя аўтарам кнігі вершаў ягонай паэзіі і фотакарцін *„Глёрыя Патрыя”.*

*29 лістапада ў Магілёве* пачаўся разгляд адміністрацыйнай справы ***Віктара Ясюкевіча*** і ***Тамары Леўскай*** (сябраў ініцыятыўнай групы кандыдата ў прэзыдэнты Ў. Ганчарыка. Іх абвінавацілі ў невыкананьні патрабаваньняў міліцыі падчас агітацыйнай кампаніі на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах.

*29 лістапада.* Суддзя Цэнтральнага раёну Менска **Паўлюшчык** прысудзіў намесьніку старшыні Беларускага Народнага Фронту сп. ***Міколу Анцыповічу*** штраф у памеры 20 мін. заробкаў за ўдзел у акцыі пратэсту супраць наладжанага Лукашэнкам так званага „усенароднага сходу” 18 траўня сёлета ў Менску. Спадара Анцыповіча тады моцна і беспрычынна пакалечылі. Сваё рашэньне пра штраф суддзя, як заўсёды, абгрунтаваў на хлусьлівых і блытаных сцьвярджэньнях міліцыянтаў.

*29 лістапада ў Горадні* адбылося мэмарыяльнае мерапрыемства ў памяць узарванай 40 гадоў таму ***Фары Вітаўта***. У гэты дзень каля 200 вернікаў сабраліся на месцы, дзе некалі стаяў знакаміты храм. Там, дзе знаходзіўся алтар, на сьнезе, яны выклалі крыж зь яловых галінак, перавязаных бел-чырвона-белымі стужкамі, і маліліся. Яны меліся правесьці тут мітынг-*рэквіем „Без гісторыі няма будучыні”* ў памяць аб разбураным храме. Аднак улады Горадні адмовілі ініцыятарам мітынгу.

З мэтай папярэдзіць магчымыя рэпрэсіі ***Дзьмітры Ів償оўскі*** выступіў перад удзельнікамі мерапрыемства і паведаміў, што мітынгу ня будзе, патлумачыў прычыны і матывы адмовы, прапанаваў удзельнікам памаліцца за беларускія сьвятыні.

Менавіта ў гэтым закліку суддзя **Ярашэвіч** угледзеў прыкметы мітынгу. Такім чынам у Беларусі ўзьнік прэцэдэнт адміністрацыйнага перасьледу за заклік *„Давайце памолімся!”* і непасрэдна за арганізацыю малітвы.

150 мінімальных заробкаў — такім аказаўся кошт малітвы для горадзенскага мастака *Дзьмітрыя Іваноўскага.* Яго асудзілі за арганізацыю „несанкцыянаванага мітынгу”.

*29 лістапада* сакратар Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Валеры Буйвал*** абскардзіў у Менскім абласным судзе прысуд Менскага раённага суду (штраф у памеры 30 мінімальных заробкаў). Ён быў затрыманы амонаўцамі ў Курапатах 9 лістапада сёлета разам з шэрагам іншых сяброў Партыі Народнага Фронту.

*Лістапад.* Улады Салігорска занепакоеныя, што моладзь не падтрымлівае і не прызнае Лукашэнку. Каб выправіць становішча, далі ўказаньне школам „прапрацоўваць” бацькоў. У школе №6, напрыклад, (дырэктар **Т.П. Цераева**) у час бацькоўскага сходу ў першых клясах настаўнікі раілі бацькам праводзіць дома „палітразмовы” са сваімі малымі, завесьці сшыткі, выпісваць туды цытаты з прамоваў Лукашэнкі і завучваць іх разам з шасьці-сямігадовымі дзеткамі напамяць.

*Лістапад.* Суд Менскага раёна вынес папярэджаньне археолягу старшаму навуковаму супрацоўніку Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук ***Міколу Крывальцэвічу***. Ён пакараны за ўстаноўку ў Курапатах крыжа ў памяць пра беларускіх археолягаў ***Сяргея Дубінскага, Аляксандра Дубінскага*** і ***Аляксандра Ляўданскага***, расстраляных 27 жніўня 1937 года. Мэмарыяльны крыж зроблены на сродкі беларускіх археолягаў і ўстаноўлены ва ўрочышчы 30 кастрычніка. Суд абвінаваціў сп. Крывальцэвіча ў правядзеньні несанкцыянаванага мітынгу. „Я не лічу парушэньнем закона прысутнасьць людзей пры ўстаноўцы крыжа на тэрыторыі могілак, якім зьяўляецца ўрочышча Курапаты. А падобныя судовыя рашэньні ўяўляюць сабой спробу застрашваньня людзей”, — заявіў вучоны.

*Лістапад.* Начальнік Упраўленьня культуры Берасьцейскага аблвыканкама **Рыгор Бусюк** папярэдзіў працаўнікоў 16-ці вясковых клюбаў і бібліятэк, што ім давядзецца шукаць іншую працу. Замкі павешаныя яшчэ на некалькі дзясяткаў культасьветніцкіх установаў, бо для аплаты паліва ім не стае фінансавых сродкаў.

***Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і прэс-служба БНФ.*** *Па матэрыялах Камісіі,СМІ, радыё, друку („Народная Воля”, „Наша свабода”, „Пагоня”, „Ніва”, „Права на Волю” і інш.)*

# АБЛІЧЧА ГНУТКАГА РУМЫНА

Як паведаміла расейскае агенцтва „Інтэрфакс”, „па запрашэньні прэзыдэнта Парляманцкай Асамблеі АБСЭ Адрыяна Севярына дэлегацыя Лібэральна-дэмакратычнай партыі Беларусі (жырыноўцы) возьме ўдзел у працы сэсіі ПА АБСЭ ў якасьці назіральніка. Паседжаньне ПА АБСЭ адбудзецца з 6 па 10 ліпеня (ужо адбылося, — П.Я.) у Бэрліне”. У склад дэлегацыі ад белжырыноўцаў увайшлі старшыня партыі С. Гайдукевіч і ягоны першы намесьнік.

У афіцыйным запрашэньні С. Гайдукевічу А. Севярын напісаў: *„Мандат 13-га Вярхоўнага Савета страціў сілу ў студзені 2001 года. Гэты парляманцкі ворган ня быў прызнаны на чатырох паседжаньнях дзеючага Камітэту ПА АБСЭ... У гэтай сувязі і я больш не зьбіраюся прымаць просьбы ад 13-га Вярхоўнага Савета, пакінуць месца для беларускай дэлегацыі ў Асамблеі... Спрабуючы прадоўжыць пашырэньне дыялёгу паміж палітычнымі сіламі ў Беларусі і сябрамі Асамблеі, я зьбіраюся працягваць запрашаць прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай апазыцыі на нашыя паседжаньні ў якасьці назіральнікаў”.*

І запрасіў... Гайдукевіча.

Гэтакія вось „дабрадзеі” Беларусі сядзяць цяпер у кіраўніцтве АБСЭ.

***Пётра ЯНОВІЧ***

# ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

***30 траўня*** сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* у чарговы раз сабраліся каля помніку Янку Купалу ў Менску, каб працягнуць традыцыйныя паэтычныя чытаньні, прысьвечаныя 120-м угодкам вялікага песьняра. Чыталі вершы, сьпявалі песьні, гаварылі пра жыцьцядайнасьць паэзіі Купалы, трагізм ягонага жыцьця.



(Фота А. Чахольскага)

***Фронтаўцы, змагары за Курапаты, засыпаюць водаадводны роў.***

***1 чэрвеня*** прыйшлі на штосуботнюю талаку ў Курапаты сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* Яны добраўпарадкавалі тэрыторыю, прыбіралі магілы, ставілі крыжы Народнага Мэмарыялу.

***6 чэрвеня*** сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* каля помніка Янку Купалу ў Менску на традыцыйных паэтычных чытаньнях дэклямавалі вершы, сьпявалі беларускія песьні.

***8 чэрвеня*** сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* наладзілі ў Курапатах штосуботнюю талаку. Прыбіралі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу, даглядалі магілы. Прыбіралі сьмецьце, пакінутае варварамі, якія рэгулярна ладзяць папойкі ў Курапатах. У гэты ж час на дарозе, пабудаванай на курапацкіх магілах, працавала тэхніка, укладваючы асфальт.

***20 чэрвеня*** сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ладзілі традыцыйныя Купалаўскія паэтычныя чытаньні каля помніка Янку Купалу ў Менску (ужо месяц праводзіцца гэтая імпрэза шточацьвер). Чыталі вершы, сьпявалі песьні, гаварылі пра творы і жыцьцё вялікага песьняра. Выступілі паэты Славамір Адамовіч, маладыя творцы Галіна Дубянецкая і Сяргей Патаранскі.

Некалькі разоў правакатары (па 2-3 чалавекі) спрабавалі сарваць мерапрыемства, лаяліся і зьнявежалі прысутных. Міліцэйская машына знаходзілася ў 150 мэтрах ад помніка, але службовыя асобы ніяк не адрэагавалі на правакацыю. Больш таго, было заўважана, што правакатары штораз прыходзяць менавіта з таго боку, дзе стаяла машына. Сябры партыі Фронту схапілі правакатараў і вытурылі іх. За ўсім назірала здымачная група СТВ, якая не зрабіла ніякіх здымкаў, а калі сьвята прадоўжылася, то й зусім некуды зьнікла.

Даўно заўважана, што „истинно русский” тэлеканал БТ нізкапробна і бяздарна камэнтуе тэму ўгодкаў вялікіх песьняроў Беларусі. Падобна на тое, што здымшчыкі СТВ зьявіліся, каб зьняць бойку каля помніка Купалу. А калі правакацыя правалілася, то й рэціраваліся. Такія вось „искусствоведы в штацком”.

***14 ліпеня*** *Старшыня Рады БНР* ***Івонка Сурвіла*** накіравала Ноту пратэсту ад імя Рады БНР у амбасаду Расеі. Тэкст ноты наступны: „У інтэрв’ю маскоўскай газэце „Известия” 10 ліпеня 2002 года, якое было перадрукаванае са скарачэньнямі ў варшаўскай *„Rzeczpospolita”* 11 ліпеня 2002 года, міністар замежных справаў Расейскай Фэдэрацыі Ігар Іваноў закрануў праблему Калінінградзкай вобласьці. Ён выказаўся за стварэньне „транзіту”, які дасьць магчымасьць свабоднага праезду грамадзянаў РФ у Калінінград праз тэрыторыю Літоўскай Рэспублікі.

На пытаньне, як разумець паняцьце „транзіт”, міністар адказаў: „Рух праз тэрыторыю Літвы ад адной расейскай мяжы да другой”.

Аднак міністар замежных справаў Расеі ня можа ня ведаць, што Літва, акрамя мяжы з Калінінградзкай вобласьцю, ня мае другой мяжы з Расеяй — яна мяжуе зь Беларусьсю. Трэба меркаваць, што менавіта гэтую мяжу і мае на ўвазе міністар.

Такая заява кіраўніка расейскага зьнешнепалітычнага ведамства ня можа быць вынікам звычайнай агаворкі. Гэтыя словы выяўляюць ігнараваньне Масквой Беларусі як незалежнай і суверэннай дзяржавы, што абсалютна недапушчальна ў практыцы міждзяржаўных стасункаў.

Рада БНР, якая ўвасабляе ідэю Беларускай Незалежнасьці і выконвае функцыі ўраду ў выгнаньні, выказвае гэтым пратэст міністэрству замежных справаў Расейскай Фэдэрацыі.”

***ТРУБА.*** 22 ліпеня антыбеларускі рэжым распачаў новы наступ на Курапаты ў сатанінскім памкненьні зьнішчыць Народны Мэмарыял. Бульдозеры ўехалі на тэрыторыю мэмарыялу і пачалі капаць глыбокую траншэю ад кальцавой дарогі (пабудаванай на курапацкіх магілах) у бок вялікага Крыжа Пакутаў. Сябрам *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ,* якія былі на месцы чарговага злачынства ўладаў, адразу стала зразумелая выдумка разбуральнікаў — пакласьці ў траншэю трубы, загадзя завезеныя ў Курапаты, і забясьпечыць пастаянны адток вады з

дарогі на Курапацкія магілы. (Яны плянавалі зрабіць балота на магілах і пад Крыжам Пакуты, затапіць яго.)

Але фронтаўцы ***Сяргей Папкоў*** і ***Ўладзімер Юхо*** усталі на шляху тэхнікі і прымусілі разбуральнікаў пакінуць тэрыторыю Народнага Мэмарыялу.

Раніцай 23 ліпеня 15 сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* пачалі працу па ліквідацыі варварства. Паставілі на шляхах да Мэмарыялу крыжы і талакой закапалі траншэю.

На тэрыторыю Мэмарыялу некалькі разоў прыязджалі супрацоўнікі КГБ і міліцыі. Зьявіліся таксама інжэнеры, адказныя за „правядзеньне работ". Фронтаўцы выказалі ім пратэст супраць іхных антызаконных праектаў і заявілі, што мабілізуюць беларускае грамадзтва на абарону Курапацкай Сьвятыні. Водаадтокі не павінны праходзіць па тэрыторыі Народнага Мэмарыялу, па магілах. Сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* арганізавалі дзяжурствы ў Курапатах.

■ Зь ліста 11 ліпеня кіраўніцтва *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* у Савет Міністраў і Дэпартамант па аўтамабільных дарогах: „Патрабуем тэрмінова спыніць будаўнічыя працы па пракладцы водаадводнай трубы на тэрыторыю Народнага помніка ахвярам расейска-камуністычнага тэрору 1937-1941 гг. — Курапаты, які мае статус культурна-гістарычнага помніка...

Вышэйшы ўзровень цынізму ў тым, што зьнішчальныя працы вядуцца ў той самы час, калі Лукашэнка падчас сустрэчы з дырэктарам ЮНЭСКО сп. К. Мацуурам заяўляў, што „ягоны ўрад" зробіць усё, каб захаваць культурна-гістарычную памяць беларускага народу".

У ноч на ***24 ліпеня*** былі зьнішчаныя 2 крыжы на Крыжовай алеі Народнага Мэмарыялу ў Курапатах. Гэта ёсьць працяг варварскай акцыі антыбеларускага рэжыму, які днямі распачаў чарговы наступ на Курапаты (улады спрабавалі пракласьці на тэрыторыі мэмарыялу трубы вадастоку з мэтай затапіць магілы). Правакацыя правалілася. Тады прыступілі да зьнішчэньня крыжоў.

***25 ліпеня*** сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* урачыста адзначылі дзень памяці Уладзімера Караткевіча. Сабраліся пад *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* ля магілы вялікага пісьменьніка на Ўсходніх могілках сталіцы, чыталі ягоныя вершы, гаварылі пра жыцьцё і творчасьць. Потым правялі чытаньні ля помніка Янку Купалу

***27 ліпеня*** сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* правялі традыцыйную суботнюю талаку ў Курапатах. Прыбіралі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу, добраўпарадкавалі магілы, садзілі кветкі, ліквідавалі наступствы нядаўняй варварскай правакацыі ўладаў, якія спрабавалі пракласьці па катлавану трубы на тэрыторыю Мэмарыялу, каб зьнішчыць магілы.

***28 ліпеня*** група сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* з г. Узда прыехала ў Менск і прывезла з сабой велізарны крыж у памяць землякоў, загінуўшых у часы расейска-бальшавіцкага тэрору. Устанавілі крыж на тэрыторыі Народнага Мэмарыялу ў Курапатах. У той жа час на другім баку Курапатаў рабочыя па загаду начальства вырвалі з зямлі два іншыя крыжы на мяжы Курапацкага ўрочышча, кінулі іх на машыну са сьмецьцем і вывезьлі.

***Валеры БУЙВАЛ***

# ДАРОЖНЫЯ ГІСТОРЫІ

*(Досьвед беларуса)*

Цяжкія часы перажывае сёньня Беларусь. Шмат беспрацоўных і проста галодных людзей. А калі ў цябе яшчэ ёсьць і дзіця (ды й не адно) — ты вымушаны думаць-прыдумваць, як зарабіць, як выгадаваць сваіх дзяцей і не памерці з голаду самому.

Гандлярамі і „ваўчкамі" сёньня на Беларусі становяцца і лекары, і настаўнікі, і вучоныя, і мастакі, якія ніяк ня ўцямяць, што зьмяніць жыцьцё можна толькі ў адзін спосаб: добра адмежавацца ад Расеі, зь якой ідуць усе нашыя беды. Гэты досьвед я атрымаў там, куды ня раз прыходзілася езьдзіць...

Паездка ў Расею ў красавіку 2002 года сталася для мяне як падсумаваньнем усяго, што я ўжо бачыў шмат разоў: мы, беларусы, і яны (рускія) — зусім розныя. Пераязджаеш невялічкі мост праз маленькую рэчку — Расея. Апынаешся зусім ў іншым сьвеце.

* * *

На расейскай мытні падсеў да мяне ў машыну мытнік (папрасіўся падвезьці яго па дарозе ў горад Красное (18 кілёмэтраў). Едзем, размаўляем.

У нас, на Бацькаўшчыне, усе палі ўзараныя, прыгожа. Таму пытаюся ў яго:

— Чаму ў вас нічога ня сеюць і не гаруць?

— А навошта, — адказвае ён мне па-расейску. — Тут акрамя аўса нічога не расьце, і таго толькі па сем цэнтнераў з гактара.

— Але ж, на мой розум, няхай сабе хоць 7 цэнтнераў, чым нічога?

— Праз сто гадоў тут вырасьце лес, — адказаў мытнік.

— Дык лепш бы вы тады садзілі саджанцы дубкоў ды сасны, а то вырастуць толькі кусты і розныя карлікавыя бярозы, — кажу.

— Ну и что, зато лес будет, — усьміхаецца ён.

— Які ж гэта лес? — зьдзіўляюся я...

* * *

Праязджаю расейскі горад Рыбінск. Усюды гразь. Нават у цэнтры горада — разруха і гразь. Уражаньне, што тут даўно не жылі людзі, а зараз — аднекуль узяліся. А пакуль іх „не было", усё развалілася. І людзі чамусьці ня могуць дадумацца, што разруху і гразь трэба прыбраць. Гэта ўражвае.

Але перажываеш сапраўдны шок, калі бачыш дамы з надпісамі: „Миша ушёл на фронт 15.05.2001 г. Убит". Такіх надпісаў — процьма.

Улады стараюцца іх „прыбраць", сьцерці, каб ніхто ня бачыў. Пакідаюць толькі тыя, дзе напісана нешта накшталт „Вася (ці Пеця) вярнуліся з фронта".

Рэкляма на вайну — гэта па-руску.

* * *

Яшчэ раней, гадоў пяць таму, калі была Першая Чачэнская вайна, я езьдзіў ў Расею, у адведкі да сваяка. Накрылі стол, і адзін расейскі хлапец, добра выпіўшы (яны п'юць ня тое, што „шмат", а вельмі шмат), спытаўся ў мяне, каго я ненавіджу.

— Навошта мне такі цяжар — некага ненавідзець. Я ўсіх люблю, — адказваю.

— Ну, такога не бывае, — пачуў я, — „надо обязательно кого-то ненавидеть!"

„І дзе ж гэта ў іх „сьвятая" Русь?, — падумалася мне. — Напэўна, стала ўжо самай „правільнаслаўнай" і захлынаецца ад нянавісьці да ўсіх".

* * *

І сапраўды, іхняя нянавісьць і непавага да ўсіх людзей проста адчуваецца на ўласнай скуры. Дзе б ты ня быў, заўсёды будзеш у прыніжаным стане (калі ня быць пільным і не даваць адпор); заўсёды трэба быць гатовым да ўсялякай небясьпекі і падману. Бо нават дамовіўшыся аб нечым, вас могуць падмануць у любы момант.

— А, брат-беларус, едем к нам, переночуешь у нас — все условия! — казаў мне адзін такі рускі, зь якім мы папярэдне дамовіліся аб супольным гандлі некаторымі нашымі таварамі, абмеркавалі цэны, колькасьць тавару і дзень прыезду. — Заўтра у вас забяруць усё па дамоўленай цане, — кажа ён.

І калі ты ўжо пагадзіўся, то май на ўвазе, што вечарам у рускіх — абавязкова п'янка за твой кошт. А раніцай шмат што залежыць ад таго, наколькі ты быў „моцны" і вытрымаў „спаборніцтва" у колькасьці выпітага.

Таго, хто павінен быў забраць твой тавар, у лепшым выпадку, ня

будзе на месцы, ці (яшчэ горай) — ён проста перадумаў (не зважаючы на ранейшую дамоўленасьць, на твае матэрыяльныя затраты, на доўгую і цяжкую дарогу, на стомленасьць).

Зразумеўшы сваю памылку, стараешся хуценька ратавацца ўцёкамі ад такіх людзей, каб ня сталася яшчэ горай...

* * *

Пасьля двух тыдняў цяжкой працы (што ўдалося прадаць, а большай часткай — не ўдалося), вяртаешся дамоў. Дарога дадому — гэта шчасьце, хоць да дому яшчэ трэба даехаць... Ляціш, як на крылах, без адпачынку і сну: хутчэй бы перасекчы мяжу. І як толькі яе пераедзеш, — можна і адпачыць, і паспаць трошкі.

* * *

Ёсьць такі страшны рускі горад Масква. У Расеі, здаецца, усе астатнія гарады і вёскі працуюць на яго.

Але на гэты страшны горад працуюць і украінцы, і беларусы...

Праехаць праз Маскву ці (што найлепш) аб’ехаць яе — нялёгкая справа, і кожны чалавек за рулём — як напятая пружына, бо трэба быць надзвычай пільным (асабліва ў Маскве).

Аднаго разу вяртаўся я дадому з Расеі. Недзе каля двух гадзінаў ночы недалёка ад Масквы (кілёмэтраў за 40-50) я ішоў на абгон калёны „камазаў”, якія везьлі драўніну. Раптам ззаду пачаў сігналіць „мэрсэдэс”, каб я саступіў дарогу. Мая хуткасьць — 120 *км* у гадзіну, ды і саступіць няма куды. Я абагнаў калёну і ўзяў управа. Але ведаючы „рускую натуру”, трэба быць пільным і быць гатовым да небясьпекі. „Мерсэдэс” абганяе мяне, таксама бярэ рэзка ўправа і рэзка тармозіць перада мной.

У такой дарожнай сітуацыі патрэбна нямала вытрымкі і напругі, каб цудам ацалець.

Прыпыняцца небясьпечна ўсюды. Таму так і едзеш да мяжы. І толькі перасекшы расейска-беларускую мяжу, адразу адчуваеш, як становіцца лёгка і проста. Заязджаеш на першы АЗС і адразу — спаць. За два тыдні сьпіш упершыню спакойна. Ты на Бацькаўшчыне.

Раней мне здавалася, што такое адбываецца толькі са мной. Але паразмаўляў з адным, другім — тое самае і ў іх.

Пачуцьцё спакою прыходзіць толькі тады, калі пакідаеш Расею.

* * *

31-га чэрвеня гэтага году да мяне падыйшоў мой сусед, Павел Трафімавіч Валадзько і сказаў, што ягоны сын Гена памёр у Маскве, папрасіў дапамагчы яму забраць цела сына і прывезьці дадому. Яму было 33 гады, два тыдні таму паехаў у Маскву на заробкі: паабяцалі 300 даляраў у месяц.

Выехалі ноччу, каб раней быць у Маскве. Прыехалі каля шасьці раніцы. У каго ні спытаеш (як ехаць да таго 10-га моргу Боткінскага шпіталя) — адзін паказвае ў адзін бок, другі ў адваротны. Ледзь знайшлі.

Тыя, з кім Гена паехаў на працу, ніхто не прышоў да нас. Прышоў рускі, які наймаў яго на працу, сказаў, што Гена выпіў „на спор” тры бутэлькі гарэлкі, заснуў і не прачнуўся.

„Вот тебе, батя, на расходы 1000 рублей *(гэта 330 даляраў ЗША)* и будь здоров,” — сказаў ён.

У моргу нам паведамілі, што ў іх так хутка труп не забіраюць, „люди неделями ждут”. Мы ўбачылі апухшых ад гора чатырох украінскіх кабет, якія прыехалі забіраць свайго адзінага кармільца (сына, мужа і брата). Забіралі яшчэ аднаго ўкраінца, але там было трох мужчынаў...

Увесь дзень пайшоў на ўсялякія даведкі. Нам дапамагаў адзін украінскі хлапец з Яремчы.

— Што ты тут робіш? — пытаюся ў яго.

— Грошы, — адказвае, і паказвае свой бок з двума кулявымі раненьнямі. — У сакавіку ледзь выжыў.

Гену Валадзько нам у гэты дзень не аддалі, сказалі — раніцай а 9-й. Прышлося спаць у машыне пад моргам. Але атмасфэра вакол нейкая вельмі трывожная. Пагаварылі з ахоўнікам тэрыторыі гэтага моргу, каб дапамог нам у выпадку якой небясьпекі ноччу, але спачуваньня не было. Тады аддалі мы яму бутэльку гарэлкі, забясьпечыўшы сабе хоць нейкую слабую гарантыю бясьпекі.

Глыбокай ноччу, калі мы спалі, у вакно пастукалі вельмі сумніўныя асобы нешта спытацца. Прадбачліва не адчыняючы машыны, мы параілі зьвярнуцца да ахоўніка, які якраз выйшаў на шум. Пабачыўшы яго, машына імгненна зьехала.

Раніцай прыехалі забіраць яшчэ аднаго беларуса з Гомельскай вобласьці. Сваякам паведамілі, што той зваліўся з рыштаваньняў і забіўся.

Выказваючы прыхільнасьць, ахоўнік сказаў нам, што кожны дзень з іхняга моргу забіраюць аднаго-двух беларусаў, а „хахлоў” яшчэ больш.

Ня ведаю, колькі гэтых моргаў у Маскве, але гэты быў дзясяты, то колькі ж беларусаў гіне ў той праклятай Маскве кожны дзень?! А за год?!

Тут прыехалі забіраць яшчэ аднаго украінца. Я ўжо не пытаўся, як і што.

Бацьку Гены Валадзько, Паўлу Трафімавічу, сказалі, каб за паслугі морга ён заплаціў 650 рублёў.

Ад гора і гэтай страшнай атмасфэры ён шмат выпіў, але не п’янеў. Прышоў нейкі чалавек у грамадзянскім, прадставіўся супрацоўнікам МУС („МВД”), папрасіў яго падпісаць паперу ( што бацька памёрлага ня мае прэтэнзіяў), і адразу з намёкам: калі, маўляў, не падпішаш — будуць праблемы вярнуцца дадому. Павел Трафімавіч падпісаў.

Труну з целам забралі. І тут я адразу пабачыў, што цемя ў Гены прабітае і зашытае, косьці чэрапа вакол — праламаныя. Галаву ўскрывалі неахайна, як п’яныя. Гэтак жа і зашылі. Правая шчака моцна падрабаная, накладзена вельмі шмат танальнага крэму, каб не было відаць сінякоў і пабояў на твары. Пальцы на руках — сінія. Калі аддалі адзежу, аказалася, што швэда і бялізна — у крыві.

„Гэта так паміраюць „у сьне” „ад гарэлкі” беларусы ў Расеі”, — падумаў я.

Тое, што гэта было забойства, для мяне стала абсалютна зразумелым.

* * *

Калі бываеш у суседняй Польшчы, нават ня верыцца, што зусім нядаўна, нейкіх 10 гадоў таму, па ўсёй Беларусі мітусіліся палякі, скупляючы беларускія тавары, усе падрад, уключаючы нават дробязі.

А вось жа падняліся, усталі на ногі. Усяго за нейкіх 10 гадоў! І ўсяго ў іх поўна. А ў Беларусі зараз — галеча і заняпад. І зараз мы, беларусы, набываем многія тавары тут.

Нядаўна вяртаўся я з Польшчы. Купіў тры каробкі алею. Беларускі мытнік агледзеў і сказаў: „Пакінь толькі адну каробку. Дзьве астатнія — нельга. Можаш дзець, дзе хочаш.”

Ну што тут рабіць? Раніца, 5 гадзінаў, і на мытні, як на зло, ніводнага самаходу. Раптам пад’ехаў адзін. У ім — два рускія праваслаўныя бацюшкі, якія ехалі на Берасьцейшчыну.

— Айцы, — прашу, — перавязіце каробку алею.

— Нет, нет, не можем.

— Ну што ж, — думаю, — ня можаце перавезьці, дык бярыце так, задарма.

— А ён добры? — пытаюцца.

— Добры, а як жа.

Узяўшы алей, айцы параіліся і зьвяртаюцца да мяне:

— Скажи, отрок, свое имя, а лучше — напиши на бумажке. И если ты православный — мы за тебя помолимся.

— А калі не праваслаўны? — пытаюся.

— Тогда молиться не будем! — катэгарычна адрэзалі айцы.

Пад’ехаў яшчэ адзін самаход, і гаспадар адразу пагадзіўся перавезьці маю другую каробку алею.

Пераехаўшы мытню, я пачакаў таго гаспадара, які вярнуў мой алей.

— А дзе ж сьвятыя папы? — спытаў ён мяне.

— А яны як пераехалі, дык іх і сьлед прастыў.

Вось такая гісторыя з гэтымі рускімі папамі.

*Лявон ВАБІШЧЭВІЧ*

# ПАМЯЦІ УЛАДЗІМЕРА КАРМІЛКІНА

14 ліпеня раптоўна памёр Уладзімер Кармілкін (нарадзіўся ў 1934 годзе). Гэта быў вельмі камунікабельны і дабрадушны чалавек. Яго ведалі ў Фронце ўсе. Ён быў нязьменным фоталетапісцам і аўдыё-апэратарам усіх фронтаўскуіх справаў, карыстаўся ўсеагульнай прыхільнасьцю. На пахаваньне яго прышло мноства людзей. Гэты чалавек выклікаў дабразычлівасьць у сэрцах.

Я запомніў яго зь першых мітынгаў Беларускага Народнага Фронту. Ён стараўся засьведчыць сваю салідарнасьць і жаданьне спрыяць беларускай справе. Памятаю, як ён казаў мне сваёй дабрадушнай скарагаворкай:

— Я, ведаеце, Зянон Станіслававіч, свайму бацьку кажу (а ён у мяне камуняка такі незгінаемы), кажу, бацька, мы ў Беларусі жывём, трэба ісьці разам зь беларусамі, дапамагаць беларусам. Нельга супраць, гэта будзе нядобра. Вось я вырашыў з Фронтам ісьці. Камуністаў не люблю. Яны мне яшчэ ў арміі душу ад’елі. Несправядлівасьці ў савецкай арміі я наглядзеўся.

Уладзімер Кармілкін здымаў і запісваў усё падрад, нястомна, з поўнай аддачай. Такі прынцып, часам, можа аказацца вельмі пазнаваўчым для гісторыі, бо зафіксаваныя ня толькі кульмінацыйныя моманты, але і шэры, нудны паўсюдны фон.

Уладзімер Паўлавіч родам са Смаленска (які цяпер пад Расеяй) і быў запісаны „рускім”, хаця я ў гэтым дужа сумняваўся. Па характару, па дабрыні і па перакананьнях ён быў адданым беларусам, бяскрыўдным і жыцьцярадасным працаўніком, які сам знайшоў сабе працу на беларускай ніве і рабіў яе самаадданна і добра.

І вось яго няма... Як гэта сумна і шчымліва. Думалася яго яшчэ ўбачыць у вольнай Беларусі. Але няўмольна круціцца кола лёсаў. Бывай, Уладзімер Паўлавіч.

*Зянон ПАЗЬНЯК*



*Уладзімер Кармілкін, 1998 г.*

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(Паводле „Народнай Волі”, „Нашай Свабоды”, радыё „Свабода”і інш. Кастрычнік - лістапад 2001 г.; працяг з №3)*

■ Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, рэнтабельнасьць рэалізаванай беларускімі прадпрыемствамі прадукцыі, работ і паслуг у студзені-жніўні 2001 г. склала 9,5% супраць 12,7% за аналягічны пэрыяд 2000 г. Рэнтабельнасьць прамысловай вытворчасьці зьнізілася з 14,8% да 12,2%, будаўніцтва — з 11% да 8,8%, гандлю і грамадзкага харчаваньня — з 10,8% да 5,1%, транспарту — з 21,2% да 17,9%, паслуг сувязі — з 26,1% да 12,5%, матэрыяльна-тэхнічнага забесьпячэньня і збыту — з 26,1% да 9,2%.

■ **„**У Беларусі ёсьць патэнцыял для разьвіцьця стасункаў з Эўразьвязам”. Гэта заявіў амбасадар Нямеччыны ў Беларусі Гельмут Фрык, выступаючы ў Менску на сэмінары *„Партнёрства. Новыя падыходы. Новыя магчымасьці”.* Амбасадар зазначыў, што пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у Эўрасаюза зьявіліся новыя падставы для пераасэнсаваньня сваёй пазыцыі ў дачыненьні да Беларусі.

Чуючы гэта, аднак, успамінаецца нешта старое. Як некалі на фронце фрыкі (ці фрыцы) крычалі: „Рус., здавайся!” Цяпер, зразумела, новы падыход у тым, каб мы здаваліся расейцам.

■ Маці асабістага лекара Лукашэнкі стала першым намесьнікам Міністра аховы здароўя. Галоўны пацыент краіны падпісаў указ аб прызначэньні на гэтую пасаду Л.А. Пастаялкі.

■ У канцы кастрычніка БТ паказала „гомельскую заяву” Лукашэнкі, зь якой можна зрабіць выснову пра ягоную датычнасьць да заказных забойстваў крымінальных элемэнтаў. Ён паведаміў, што ў свой час загадаў скласьці каталёгі крымінальных элемэнтаў краіны. Тонам пахана Лукашэнка заявіў: **„Нашы жулікі без аховы ходзяць у Беларусі, ня кажучы ўжо пра прыватных прадпрымальнікаў. Чаму? А мы, кажа, спакойна ходзім у пад’езьдзе, мы ведаем, што ў нас ніхто страляць ня будзе. А чаму? А таму, што прэзыдэнт парасстаўляў усіх на месца. Глядзіце, мужыкі, ня дай Бог... Усім будзе. Так, я сапраўды ў Менску (у Гомлі менш) праз пэўных жулікаў паставіў у вядомасьць 5 гадоў таму: ня дай Бог, толькі недзе вы створыце сытуацыю крымінальную, я вам паадрываю галовы. А мы ж ведаем, колькі іх і хто яны, гэтых злодзеяў у законе. Уся міліцыя ведае. Яны гэтага страшна баяцца. „Да ну, хлопцы, бацька сказаў — замочыць.” Быў выпадак, калі яны няслушна сябе павялі. Памятаеце вы гэтых Шчаўлікаў ды іншых. Дзе яны цяпер? Таму ў краіне парадак, і ўсе задаволеныя, і дакладаюць у службу бясьпекі: „Тры тышчы галоў за Вас прагаласавала.”**

Лукашэнка, фактычна, прызнаў, што кантралюе крымінальны сьвет, а крымінальнікі за яго галасуюць на выбарах. Ён намякнуў: „Бацька замачыў Шчаўліка”. Гэта мянушка менскага злодзея ў законе, які зьнік бязь вестак ды якога (паводле былых сьледчых) забіў „эскадрон сьмерці”.

kamunikat.org

■ Бюро ў справах дэмакратыі, правоў чалавека і працы Дзярждэпартаманту ЗША апублікавала гадавую справаздачу аб сітуацыі ў галіне свабоды рэлігіі ў сьвеце. Беларусь у сьпісе краінаў-парушальнікаў, дзе існуе дыскрымінацыйнае заканадаўства і палітыка ў дачыненьні да некаторых рэлігіяў. Сітуацыя ў Беларусі за апошнія год пагоршылася. Кіраўніцтва краіны працягвала палітыку падтрымкі „асноўнай канфэсіі" — расейскай праваслаўнай царквы і дыскрымінацыі іншых веравызнаньняў: пратэстанцкіх дэнамінацыяў, Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, вуніятаў і каталікаў. Лідэр экзархату РПЦ мітрапаліт Філярэт узнагародзіў трох журналістаў „Народнай газэты" за паклёпніцкія артыкулы аб пратэстанцкіх грамадах. Абмежавальны характар дзеяньняў уладаў і адпаведнага закону адчувае каталіцкая царква, якой не хапае сьвятароў. У сакавіку летась суд адхіліў скаргу габрэйскіх арганізацыяў на публікацыю антысэміцкай кнігі „Вайна па законах подласьці". У сьнежні летась менская сінагога стала аб'ектам бомбавага замаху. Шэраг разоў былі апаганеныя габрэйскія могілкі.

■ Амбасадар Італіі ў Менску пакінуў межы Беларусі і выехаў на радзіму дзеля правядзеньня кансультацыяў з урадам. Дэмарш зьвязаны з арыштам італьянскага журналіста Піў Анжэла Антоніа, якога па абвінавачваньні ў шпіянажы беларускія ўлады засадзілі за краты на чатыры з паловай гады. Разам зь ім „за здраду радзіме" да чатырох гадоў зьняволеньня прыгаворана беларуская грамадзянка Ірына Ушак.

■ Беларусь зьяўляецца буйнейшым пастаўшчыком зброі радыкальным ісламскім групоўкам. Пра гэта паведамляе агенцыя ДПА са спасылкай на ЦРУ. Толькі ў першай палове 2001 г. Беларусь падпісала кантракты з арабскімі, палестынскімі і альбанскімі групоўкамі на пастаўку зброі на агульную суму больш за 500 мільёнаў даляраў.

■ Саюз правых сілаў Расеі і Аб'яднаная Грамадзянская Партыя (АГП) зь Беларусі рыхтуюцца на пачатку 2002 году падпісаць дамову аб супрацоўніцтве. А. Лябедзька (ён жа Лебедько) „са таварышчы" наведаў Маскву у канцы кастрычніка і потым заявіў, што вынікі сустрэчаў „нас задавальняюць".

Як заўсёды, АГП ня згадвае пра ўвагу да забесьпячэньня незалежнасьці нашай краіны ў дыялёгах з маскоўскімі баярамі.

■ Новым кіраўніком спэцыяльнай рабочай групы па Беларусі Парляманцкай Асамблеі АБСЭ прызначана фраў Ута Цапф, дэпутат бундэстага. Яна бывала ў нашай краіне. Яшчэ адзін нямецкі „друг" Беларусі...

■ Беларусь працягвае лідзіраваць сярод краінаў былога СССР па ступені абясцэньваньня нацыянальнай валюты. На 31 кастрычніка ў пяцёрку краінаў з найбольш абясцэненымі валютамі ўвайшлі Беларусь *(15.090.000 рублёў за даляр ЗША; да дамінацыі),* Туркменістан, Грузія, Украіна, Узбекістан.

■ У Расеі гінуць беларусы. Рабочыя магілёўскага будтрэсту №12 вярнуліся з працы ў Падмаскоўі, напалоханыя сьмерцю свайго калегі. *Уладзімер Раслаўцаў* памёр у Расеі, бо не дачакаўся медычнай дапамогі. Рабочым перад камандзіроўкай абяцалі заробак у 150-200 даляраў, бясплатнае жыльлё і медабслугоўваньне, якаснае харчаваньне. Замест гэтага яны жылі ў халодных хлявах ды пабачылі сьмерць свайго земляка. На ўезьдзе ў Расею іх адразу ж абрабавалі рэкецёры. У Маскве захапілі ў палон міліцыянты, абвінаваціўшы ў парушэньні пашпартнага рэжыму. Некаторыя з рабочых вярнуліся дадому з запаленьнем лёгкіх. Усе атрымалі ад 40 да 100 даляраў і вярнуліся задаволеныя, што засталіся жывыя.

■ Бабруйск — наркатычная сталіца Магілёўшчыны. За 9 месяцаў сёлета ў Бабруйску ўзбуджаныя 144 крымінальныя справы, зьвязаныя з наркотыкамі. Гэта на 75% больш, чым за адпаведны леташні пэрыяд. Больш за 130 асобаў прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці.

■ Афіцыйная сталічная расейскамоўная газэта *„Вечерний Минск"* паведаміла чытачам усяго праз 2 месяцы пасьля выбарчага фарсу: „Шырокая грамадзянская кааліцыя, створаная ў падтрымку кандыдата на прэзыдэнта Уладзімера Ганчарыка, выканала свае функцыі (?!) Праўда, фармальна яшчэ ня склала паўнамоцтвы (каму, можа Г.-Г. Віку?) Пасьля паразы на выбарах адзінага кандыдата ад „апазыцыі" гэтае фармаваньне засталося бяз лідэра і, фактычна, згубіла дзеяздольнасьць. Як правыя, так і левыя прадстаўнікі палітычнага спэктру зыходзяцца на думцы, што неабходна падумаць пра стварэньне новых блёкаў" (чытай: новых грантаў).

■ У Кангрэсе ЗША сэнатар-рэспубліканец Джэсі Хэлмс унёс на разгляд Сэнату законапраект пад назвай „Акт аб дэмакратыі ў Беларусі 2001 г." Сп. Хэлмс лічыць, што Беларусь з-за Лукашэнкі стала выспай цэнзуры, рэпрэсіяў і каманднай эканомікі на эўрапейскім кантыненце — „Кубай Эўропы". Закон павінен стаць адказам ЗША апошняму дыктатару Эўропы А. Лукашэнку на прайшоўшыя 9 верасьня ва ўмовах задушэньня правоў і свабодаў чалавека прэзыдэнцкія выбары і можа дапамагчы вярнуць Беларусь у шэраг дэмакратычных эўрапейскіх краінаў. Законапраект прадугледжвае спыненьне міжнароднага супрацоўніцтва з урадам Лукашэнкі, замарожваньне активаў Беларусі ў ЗША, забарону гандляваць зь беларускім урадам і прадпрыемствамі, дзе маецца доля дзяржавы, а таксама адмаўляе афіцыйным асобам рэжыму наведаць ЗША.

***Нэгатыўны бок праекта (у якім выяўляецца поўнае і хранічнае неразуменьне амэрыканцамі сытуацыі ў Беларусі) — гэта прапанова выдзеліць 30 мільёнаў даляраў лукашэнкаўскай „апазыцыі" на разьвіцьцё „дэмакратыі" ў Беларусі. Як быццам у амэрыканскай палітыцы ніхто ня ведае, што такое „кіруемы канфлікт" на Беларусі і як адбывалася ўнутраная акупацыя краіны, як Масква разам з АБСЭ (Ганс Вік) стварылі лукашэнкаўскую „апазыцыю" і як яны супольна працуюць супраць беларускага Адраджэньня і незалежнасьці Беларусі.***

***Тым часам у „апазыцыі" (якая дачулася пра мільёны) зноў прачнулася вялікая цікавасьць да „дэмакратыі".***

■ Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў вядомы сьпявак Яраслаў Еўдакімаў заявіў: калі Лукашэнка зноў стане прэзыдэнтам Беларусі, ён адмовіцца ад званьня народнага артыста. Сваё слова артыст стрымаў.

■ Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў сітуацыя ў эканоміцы катастрафічна пагаршаецца. За верасень-кастрычнік сярэдні ўзровень заробкаў у народнай гаспадарцы ўпаў у 20 разоў (!) у параўнаньні з перадвыбарчым жніўнем. На 31 кастрысніка запазычанасьць дасягнула 40,9 мільярдаў рублёў, што склала 9,5% ад узроўню фонду заробкаў папярэдняга месяца. Для параўнаньня: у жніўні гэты паказчык раўняўся 0,5%. Львіная доля запазычанасьці па заробках прыпадае на сельскую гаспадарку — 32 мільярды рублёў, ці 63% запазычанасьці.

■ Сёньня ў Беларусі больш за 30 тысячаў сацыяльных сірот, дзяцей, якія маюць жывых бацькоў. Штогод колькасьць сацыяльных сірот узрастае на пяць тысячаў, што ў сваю чаргу выклікае рост падлеткавай злачыннасьці. Такое становішча сьведчыць пра крызіс сям'і ў грамадзтве.

■ Адміністрацыя расейскага запалярнага гораду Нарыльска высока ацэньвае маральны выгляд беларуса. Толькі грамадзянам нашай краіны аказаны высокі давер — права наведаць Нарыльск і нават жыць у ім (якое шчасьце!). Усе астатнія замежнікі з гораду будуць дэпартавацца.

■ 19-20 лістапада ў Вільні адбылося выязное паседжаньне Палітычнага камітэту Парляманцкай Асамблеі Рады Эўропы, дзе разглядалася беларускае пытаньне. „Аб'яднаная апазыцыя" (ці як яе цяпер называць?) езьдзіла ў Вільню прадстаўляць свой (?) праект „Пакрокавай стратэгіі для Беларусі". С. Шушкевіч, С. Калякін ды А. Лябедзька (ён жа Лебедько) ня былі нават дапушчаныя на слуханьні па Беларусі, якія праводзіліся за зачыненымі дзьвярамі. Да легендарных (а лепш сказаць, ужо міфалягічных) чатырох патрабаваньняў

„апазыцыі” „апазыцыянэры” далучылі пару новых нюансаў. Так, яны заявілі пра неабходнасьць удзелу ў любых выбарчых кампаніях (!). Яны прапануюць ПАСЭ стварыць роўныя ўмовы для працы ў эўраструктурах як для афіцыйнай лукашэнкаўскай дэлегацыі, так і для „апазыцыі”. Эўропе прапануецца не прызнаваць лукашэнкаўскі нацыянальны сход за дэмакратычна абраны парлямант, але падтрымліваць зь ім кантакты.

■ Калі ў 1994 г. у Беларусі было затрымана 18 тысячаў падлеткаў у нецьвярозым стане, летась — 29 тысячаў, то за дзясяць месяцаў сёлета — ужо 30 тысячаў.

■ У лечкамісіі (элітным рэспубліканскім шпіталі) новы галоўны лекар. Цяпер на гэтай пасадзе — асабісты лекар Лукашэнкі Ірына Бельская.

■ Дэпутаты Талачынскага райсавету на апошняй сэсіі казалі пра тое, што за дзевяць месяцаў 25% гандлёвага абароту ў раёне склала рэалізацыя віна-гарэлачных вырабаў. На паліцах крамаў ляжаць нераскупленыя кілбаса, крупы, макароны, малочныя прадукты і г.д. Нават мыла значна меней. Народ на такія заробкі аддае перавагу гарэлцы.

■ У Берасьцейскай вобласьці павялічыўся аб’ём продажу танных вінаў, паводле зьвестак абласнога ўпраўленьня статыстыкі. За 9 месяцаў сёлета такога дабра рэалізавалі на 79,1 мільярды рублёў, г.зн. на 11% больш, чым за адпаведны пэрыяд 2000 г.

***Валеры БУЙВАЛ***



(Фота З. Пазьняка)

*Лёзунг.*

# NIECH ŻYJE BIAŁORUŚ!

O obwodzie Kaliningradzkim mówiono od 1996 roku, kiedy komentowałem wypowiedzi A. Łukaszenki o „korytarzu” przez Polskę.

No, właśnie, do czego korytarz Łukaszence? Moskwa za plecami „sojusznika” już wtedy badała ten przyszły problem.

Od dawna istnieje strategia działania Rosji we Wschodniej Europie. Wątpię, ze coś podobnego istnieje na Zachodzie. W każdym bądź razie stroną aktywną jest Rosja. Zachód ciągle podąża za propozycjami Wschodu.

Oświadczenie Prezydenta Francji Chiraca w sprawie połączenia bezwizowego z obwodem Kaliningradzkim i wypowiedzi na ten temat polityków europejskich wskazują, ze już nikt w Europie, dosłownie mówiąc, nie chce walczyć o Białoruś i nawet o Litwę.

W ciągu ostatnich miesięcy politycy, rozmawiając o „korytarzu” czyli „tranzycie” z obwodu Kaliningradzkiego do Rosji, nawet na wyższym szczeblu zachowują się tak, jak by Białoruś nie istniała.

Rosyjski Minister spraw zagranicznych I. Iwanow powiedział 10 lipca gazecie „Izwiestija”, że chodzi nie o „korytarz” przez Polskę, lecz o „tranzyt” bezwizowy przez Litwę i że ten „tranzyt” oznacza: „ruch przez terytorium Litwy od jednej rosyjskiej granicy do drugiej.”

Ale Litwa nie ma „drugiej” granicy z Rosją na wschodzie. Tam jest Białoruś.

Wypowiedź rosyjskiego ministra brzmi na tle bezprecedensowego, po drugiej wojnie światowej, oświadczenia prezydenta Putina (24 czerwca) o konieczności, aneksji Białorusi przez Rosję.

Nie chodzi tutaj o burzę, którą wywołały tu w kręgu narodowo-niepodległościowym (BFN) wypowiedzi Rosjan, nie chodzi o notę protestacyjną w imieniu Białoruskiej Republiki Ludowej (rząd na wygnaniu), lecz chodzi o dziwne milczenie w Europie.

Jako historyk jestem wstrząśnięty, że po upływie 64 lat po „Anschlussie” Austrii, powtarza się, nawet w szczegółach, taka sama historia na wschodzie Europy i powtarza się taka sama ślepota międzynarodowego społeczeństwa.

Nie mówię teraz o niebizpieczeństwie dla Europy ze strony pojelcynowskiej Rosji, lecz nie mogę nie zwrócić uwagi, że w latach 30-tych cała Austria zgodziła się na „Anschluss”. Natomiast na Białorusi jest zupełnie inna sytuacja. Białorusini nie chcą być w Rosji. Olbrzymia większość społeczeństwa białoruskiego (nawet według rosyjskich informacji – więcej niż 90%) nie chce Rosji, nie chce stracić niepodległości.

Oświadczenie Putina o aneksji w stosunku do członka ONZ i suwerennego państwa jest bez wątpienia przejawem agresji, łamaniem prawa międzynarodowego, barbarzyńską polityką.

Może ktoś oczekuje, że białoruskie społeczeństwo, aktywne grupy społeczne, partie, emigracja kapitulują? Może spodziewa się, że Białoruś nie będzie walczyć?

Nawet Rosja tego nie oczekuje. Przygotowuje akty prawne „O włączeniu do Federacji Rosyjskiej...”, „O zmaganiu z ekstremizmem...”, z „terroryzmem” i inne.

Stwarza się grunt prawny, żeby, nazywając opór białoruski „ekstremizmem”, lub „terroryzmem”, wyniszczyć białoruską inteligencję, ruch narodowo-wyzwoleńczy (najpierw BFN), a w końcu i cały naród. Mamy wielkie historyczne doświadczenie w XX stuleciu i trzy miliony ofiar zamordowanych przez rosyjski NKWD (który teraz jako KGB rządzi w Rosji i na Białorusi). Mamy przykład Czeczenii.

No, rzeczywiście, za Białoruś będą umierać tylko Białorusini. Europa nie będzie. Nikt nie czeka. (Pamiętacie: „czy warto umierać za Gdańsk?”) Mówiąc o kolejnym „korytarzu” czyli „tranzycie” z obwodu Kaliningradzkiego, wszyscy „ze zrozumieniem” milczą o Białorusi. Białoruś w głowach milczących już nie istnieje. Chociaż żadnym „korytarzem” („tranzytem”) nie można ominąć Białorusi.

Białoruska tragedia nadal trwa. Ale wiem, że nagle wszystko może się zmienić. Tam, gdzie był pokój, już go może nie być. Taka często jest cena milczenia i przemilczenia, kiedy ma się do wyboru tylko jedno postępowanie: umrzeć za wolną Białoruś.

***Zianon PAŹNIAK***
***Przewodniczący Białoruskiego***
***Frontu Narodowego „Odrodzenie”***

*25 lipca 2002 r.*
*Warszawa*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**